МЯНЯЮ СТАТУС ДАЧНІКА...

7

ЗЯМЛЯ СЛАВУТЫХ...

11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

6 СНЕЖНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 236 (30116)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ШПАКОЎСКІ, саветнік-пасланнік пасольства Беларусі ў Расіі:

«У цяперашняй геапалітычнай камбінацыі Беларусь знаходзіцца ў лагеры рэфарматараў светапарадку — прыхільнікаў шматпалярнасці. Блізкія адносіны з Расіяй і Кітаем істотна ўзмацняюць пазіцыі нашай краіны ў свеце, які змяняецца. Перагаворы са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам напярэдадні адзінага дня галасавання па выбарах новага складу парламента і мясцовых саветаў, фарміраванне корпуса дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу маюць стратэгічнае палітычнае значэнне».

Усё — сваё!

Фота БелТА.

Кладаўшчык УП «Партызанскае», што ў Мінскім раёне, Анастасія ЗЕЛЯНЕЎСКАЯ.

Стабілізацыйныя фонды ў краіне сфарміраваны пад поўную патрэбу на міжсезонны перыяд. У сховішчы закладзены 122,8 тысячы тон садавінаагароднінай прадукцыі: бульбы, морквы, капусты, буракоў, яблыкаў і цыбулі рэпчатай.

КАРАТКА

•Чатыры вялікія лядовыя пляцоўкі будуць працаваць у Віцебску гэтай зімой, іх заліванне ўжо пачалося.

•У Мінску падчас навагодніх мерапрыемстваў транспарт будзе хадзіць часцей.

•Мінпрам: экспарт нашай прадукцыі ва Узбекістан за студзень — верасень вырас удвая.

•Беларусь і Расія пашыраць супрацоўніцтва ў сферы выкарыстання мірнага атама.

•Акцыя «Нашы дзеці» на Міншчыне стартуе абласным інклюзіўным фестывалем творчасці «Запалі сваю зорку».

•Зубовіч прызнаны найлепшым гульцом 30-га тура чэмпіянату Беларусі па футболе, Ахмедзі забіў самы прыгожы гол.

У сезон

НЕ СЯДЗІЦЦА Ў ХАЦЕ?

Куды падацца на зімовыя канікулы

Зіма сёлета выдалася марознай і снежнай. Але замест таго, каб ныць і скардзіцца на холад, ці не лепш атрымаць задавальненне ад сапраўднага зімовага надвор'я? Спецыялісты сферы турызму сцвярджаюць, што зімовы сезон можа быць не ў меншай, а можа, і ў большай ступені багаты на турыстычныя ўражанні, чым летні. Прычым для іх атрымання можна нават не выязджаць з роднай Беларусі, галоўнае — быць мабільным і адкрытым новым эмоцыям, вывучыць прапановы на перадnавагодні, навагодні і калядны сезон і не ленавацца спланаваць свой маршрут.

СТАР. 4

Камунальныя стасункі

ТОНЫ СОЛІ ДЛЯ ДАРОГІ

Як камунальнікі і дарожнікі змагаюцца з зімовай галалёдзіцай

Апрацоўваць спецыяльнымі сродкамі абутак перад выхадам на вуліцу ў мокрае снежнае надвор'е, насіць флікеры, своечасова мяняць калёсную гуму на зімовую, не перашкаджаць снегаприборачнай тэхніцы на дарозе, чысціць плошчу вакол свайго аўто. Гэтыя і іншыя парады спецыялісты даюць вадзіцелям і пешаходам, каб зіма прайшла з найменшымі наступствамі.

СТАР. 3

Фота БелТА.

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на І паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

Дзяржаўны інтарэс

КУЛЬТЫВАВАЦЬ, ПРАПАГАНДАВАЦЬ І ЎКАРАНЯЦЬ НАША

Рэспубліканскі савет па гістарычнай палітыцы абмеркаваў новыя вучэбныя праграмы і культурнае імпартазамяшчэнне

Пасяджэнне Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы прайшло на чале з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Ігарам СЕРГЕЕНКАМ.

З першых дзён дзейнасць Савета была нацэлена на ўдасканаленне гістарычнай адукацыі. Гэтыя пытанні былі ўключаны ў парадак дня і ўчарашняга пасяджэння. Члены Савета абмеркавалі распрацоўку вучэбных праграм па гісторыі беларускай дзяржаўнасці для сярэдняй спецыяльнай адукацыі і па гісторыі Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі для 10-х класаў.

Міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ таксама праінфармаваў удзельнікаў пасяджэння аб падыходах да развіцця гістарычных часопісаў, якія знаходзяцца ў яго ведамстве. У прыватнасці, міністэрства прапануе абнавіць канцэпцыю часопіса «Гісторыя і грамадазнаўства» — выданне возьме курс на навукова-папулярны фармат, каб прыцягнуць больш шырокую аўдыторыю. Пры гэтым часопіс, хутчэй за ўсё, атрымае іншую назву.

Асобным пунктам Савет разгледзеў пытанні выдавецкай дзейнасці. Абмеркаваны падыходы Міністэрства інфармацыі да выключэння з продажу выданняў, якія скажаюць гістарычную праўду, і алгарытм міжведамаснага ўзаемадзеяння па выключэнні з бібліятэчных фондаў экстрэмісцкіх выданняў. Асноўны даклад па гэтай тэме зрабіў **міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ.**

Пры гэтым кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка растлумачыў журналістам, што ў Беларусі ўжо даўно працуе камісія, якая прызнае тыя ці іншыя выданні экстрэмісцкімі або тымі, што змяшчаюць экстрэмісцкія заклікі. Таму на пасяджэнні адбылося прамежкавае падвядзенне вынікаў. «І, можа, наспела неабходнасць выпрацаваць крыху іншыя механізмы. Размова не ідзе аб фізічным знішчэнні тых ці іншых выданняў», — дадаў ён.

Міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ расказаў аб выпрацоўцы адзіных падыходаў да рэалізацыі культурнага імпартазамяшчэння. Паводле яго слоў, падрыхтаваны праект адпаведнай канцэпцыі на 2024—2026 гады, яна будзе накіравана на ўсе сферы жыцця грамадства. «Мэтай з'яўляецца забеспячэнне культурнай бяспекі Беларусі», — сказаў міністр.

Асаблівая ўвага ў дакументе ўдзелена захаванню гісторыка-культурнай спадчыны і нацыянальных традыцый, развіццю нацыянальнай мастацкай культуры. Асобныя кірункі датычацца культуры побыту, грамадскіх адносін і вытворчасці.

«Мы гаворым аб тым, як культываваць, прапагандаваць і ўкараняць наша», — адзначыў Ігар Сергеенка.

Як расказала **старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна ЛУГІНА,** гандлёвыя аб'екты ў гэтым годзе сталі цесна супрацоўнічаць з рамеснікамі, і іх прадукцыя з нацыянальным каларытам карыстаецца папулярнасцю.

Першае пасяджэнне Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта прайшло на базе Нацыянальнай акадэміі навук у сакавіку 2022 года. Савет быў створаны па распараджэнні кіраўніка дзяржавы і працуе на пастаяннай аснове, у ім дзейнічаюць чатыры камісіі: па канцэптуальных асновах айчыннай гісторыі, па навукова-метадычным суправаджэнні гістарычнай палітыкі, па інфармацыйна-асветнай рабоце і па знешнепалітычным суправаджэнні гістарычнай палітыкі.

Падводзячы вынікі работы Савета за гэты час, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар Сергеенка адзначыў, што ў мінулым годзе ўдалося зрушыць з месца тэму выкладання гісторыі Беларусі ў ВНУ і ўдасканаліць школьную гістарычную адукацыю. У гэтым годзе былі арганізаваны на больш высокім узроўні навуковыя канферэнцыі па пытаннях захавання гістарычнай памяці, наладжана цеснае ўзаемадзеянне з расійскімі калегамі.

Паводле БелТА.

Парламенцкі дзённік

ФАРМАТ — НОВЫ, ТЭМЫ — АКТУАЛЬНЫЯ

Адбылося пасяджэнне міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расіі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве. Перад пасяджэннем Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла сустрэчу з намеснікам Старшыні Савета Федэрацыі Юрыем ВАРАБ'ЁВЫМ. У час сустрэчы абмяркоўваўся дасягнуты ўзровень і перспектывы міжпарламенцкага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі, рэалізацыя сумесных праектаў і ініцыятыў, падрыхтоўка да правядзення чарговага форуму ў Віцебскай вобласці, уключаючы тэматыку, тэрміны правядзення і фармат, паведамілі ў Савеце Рэспублікі.

Як адзначыла Наталля Качанава, беспрэцэдэнтна высокі ўзровень палітычных адносін і ўзаемнага даверу паміж дзвюма краінамі і яе лідарамі абумоўлівае неабходнасць пастаяннага ўзмацнення міжпарламенцкага супрацоўніцтва. Савет Рэспублікі і Савет Федэрацыі цесна ўзаемадзейнічаюць абсалютна па ўсіх напрамках, не абмяжоўваючыся рамкамі заканатворчай дзейнасці. Многія сумесныя праекты набылі традыцыйны характар і па праве могуць лічыцца брэндамі Саюзнай дзяржавы.

У ліку найбольш знакавых — Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які ўпэўнена набірае абароты. Юбілейны X Форум ва Уфе стаў самым маштабным за ўсю яго гісторыю і абнавіў рэкорды. У рабоце прынялі ўдзел больш за 4,5 тысячы чалавек, якія прадстаўляюць каля 60 рэгіёнаў Расіі і ўсе вобласці Беларусі. Падпісана каля 100 пагадненняў і кантрактаў на агульную суму каля 110 мільярдаў расійскіх рублёў.

«Пры гэтым форум чарговы раз даказаў сваю запатрабаванасць і эфектыўнасць у якасці найважнейшай пляцоўкі не толькі для падпісання кантрактаў, дэманстрацыі прамысловага і аграрнага патэнцыялу, але і для ўмацавання культурных і духоўных сувязяў народаў дзвюх краін. Гэта тое, што трэба шанаваць і берагчы, перадаваць з пакалення ў пакаленне як адно з магутных звёнаў дружбы народаў Беларусі і Расіі», — падкрэсліла спікер Савета Рэспублікі.

Улічваючы маштаб форуму, узровень прынятых рашэнняў і іх значнасць, прызнана мэтазгоднасць узмацнення яго сістэматызавальнай, каардынацыйнай, кантрольнай, інфармацыйна-аналітычнай функцый. Першы крок ужо зроблены — перафарматавана прызначэнне міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве. Абноўлены рэгламент камісіі, а ў якасці адной з форм яе работы мяркуецца заслухоўванне міністраў і іншых адказных за выкананне выніковых дакументаў з наступным дакладам на чарговым пленарным пасяджэнні форуму.

«Мы хочам прапанаваць нашым расійскім калегам не адзін горад, а два, якія размешчаны побач, — Віцебск і Полацк. Праграму мерапрыемстваў форуму мяркуецца распланаваць на два дні: першы — гэта работа секцый, а другі — пленарнае пасяджэнне. Прыкладная тэматыка XI Форуму — сумеснае інавацыйнае развіццё, рэалізацыя саюзных праграм, у прыватнасці па імпартазамяшчэнні, якія забяспечваюць эканамічную бяспеку Беларусі і Расіі, — вызначана сумесна са Старшынёй Савета Федэрацыі Валянцінай Іванаўнай Матвіенка ў рамках мерапрыемстваў Міжпарламенцкай Асамблеі СНД у Бішкеку», — агучыла планы мерапрыемства, якое мае адбыцца, Наталля Качанава.

На пасяджэнні міжпарламенцкай камісіі таксама на прыкладзе Гомельскай і Ніжагародскай абласцей быў разгледжаны ход рэалізацыі заключаных у рамках форумаў пагадненняў аб супрацоўніцтве, а таксама механізм мадэльнай заканатворчасці як важны інструмент мэтанакіраванага збліжэння нацыянальных прававых сістэм.

«Перспектыўнасць дадзенага фармату пацвярджаецца яшчэ і тым, што былі ўзняты пытанні, якія датычацца не толькі міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, але і далейшага развіцця Саюзнай дзяржавы, беларуска-расійскіх адносін у цэлым. Гэта дазваляе нам выпрацоўваць дзейсныя рашэнні ў дачыненні да будучых выклікаў, ствараць уласную стратэгічную мадэль міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння дзвюх краін», — падкрэсліла Наталля Качанава.

У прыватнасці, унесены прапановы аб пашырэнні пераліку магчымых заказчыкаў саюзных праграм шляхам уключэння органаў выканаўчай улады рэгіёнаў (у мэтах фінансавання з саюзнага бюджэту, напрыклад, навукова-тэхнічных распрацовак для развіцця прамысловых аб'ектаў у агульных інтарэсах), аб маштабаванні паспяховай практыкі функцыянавання на рэгіянальным узроўні саветаў дзелавога супрацоўніцтва з удзелам у іх рабоце прадстаўнікоў парламенцкага корпуса, аб плануемым парадку падрыхтоўкі мадэльных законаў Саюзнай дзяржавы.

Тэмамі наступных пасяджэнняў міжпарламенцкай камісіі могуць стаць рэалізацыя ініцыятывы аб стварэнні асацыяцыі інавацыйных кластараў і тэхнапаркаў, саюзнага банка грамадзянскіх ініцыятыў, саюзнага цэнтра інфармацыйнага процідзеяння, выданне манаграфічнага твора аб Саюзнай дзяржаве, распрацоўка памятнага маршруту пад умоўнай назвай «Цярновы вянок нацызму» і шмат іншых актуальных ідэй.

«Мяркую, што перафарматаванне з улікам цяперашніх геапалітычных рэалій дзейнасці міжпарламенцкай камісіі можа служыць прыкладам для больш актыўнага ўдзелу ў міжрэгіянальных працэсах інтэграцыйных структур Саюзнай дзяржавы — Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Пастаяннага камітэта, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Такі падыход азнамянуе сабой чарговую вяху ў гісторыі ўзаемадзеяння беларускіх і расійскіх рэгіёнаў, сфарміраваўшы новую архітэктуру гэтых адносін».

Сацыяльны вектар

РОЎНЫ ДАПАМАГАЕ РОЎНАМУ

За апошнія пяць гадоў у Беларусі ў два разы павялічылася колькасць валанцёраў «сярэбранага» ўзросту

Пра гэта журналістам расказала міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ падчас II Рэспубліканскага злёту «сярэбраных» валанцёраў, які прайшоў учора ў Магілёве.

«Мы стартавалі ў 2019 годзе і правялі першы злёт. Тады па ўсёй Беларусі было ўсяго дзве тысячы валанцёраў «сярэбранага» ўзросту. Мы ўбачылі водгук ад пажылых людзей, вялікую цікавасць да гэтага кірунку. Вядома, у валанцёрскім руху больш моладзі. І калі далучыліся людзі элегантнага ўзросту да гэтага руху, мы паставілі сабе задачу максімальна развіваць яго, — расказала яна. — У 2020 годзе была прынята нацыянальная стратэгія «Актыўнае даўгалецце», і адзін з напрамкаў — гэта якраз развіццё валанцёрскага руху. І па факце мы сёння маем каманду валанцёраў пажылога ўзросту, якая павялічылася амаль у два разы».

Паводле слоў міністра, ёсць вялікая колькасць кірункаў, у якіх сябе праяўляюць такія валанцёры. «Гэта гуртковая праца, дзе нашы валанцёры, выходзячы са свайго прафесіяналізму, дзеляцца ім, навучаюць спевам, танцам, вязанню, замежным мовам. Напрамкаў мора, дзе яны ў якасці валанцёраў выкладаюць такім жа людзям, як самі. Яшчэ адзін цікавы кірунак — творчыя калектывы. На пенсіі яны заспявалі, затанцавалі, сталі пісаць вершы, музыку і песні, — падзялілася яна. — Валанцёры «сярэбранага» ўзросту патрануюць сем'і, дзе выхоўваюцца дзеці-інваліды, яны дапамагаюць людзям, у якіх ёсць сур'ёзныя праблемы са здароўем, інвалідам. І тут атрымліваецца, што роўны дапамагае роўнаму. Гэты кірунак таксама набірае абароты».

Валанцёрскі рух — важны элемент развіцця грамадства. «Калі чалавек бясплатна — не важна, колькі яму гадоў, — можа падарыць любоў, дабрыню, цеплыню чалавеку, часам абсалютна незнаёмаму, — гэта дарагога варта. Гэта дапамагае зусім па-іншаму пачувацца самому валанцёру, а самае галоўнае — атачыць дабрынёй, зарадзіць усіх тых, хто знаходзіцца побач з ім. На першым злёце ў Мінску мы ўбачылі гэту пазітыўную энергетыку і жаданне актыўных людзей сталага ўзросту развівацца далей. Ёсць розныя праекты, якія заслугоўваюць увагі і якія трэба тыражаваць на ўсю краіну», — падзялілася яна.

У Беларусі на сёння пражывае 1,5 млн чалавек ва ўзросце 65+. «Каманда пажылых людзей — сур'ёзная сіла. І наша задача — максімальна выцягнуць іх з кватэр, дамоў, каб яны ішлі на танцпляцоўкі, каб яны спявалі, каб яны размаўлялі. Усе канцэрты, вялікія і малыя пляцоўкі — гэта таксама нашы валанцёры. Я бачу людзей, якія глядзяць на іх. І гэтая энергетыка дазваляе астатнім задумацца аб тым, што жыццё працягваецца. І якое яно будзе — залежыць ад кожнага з нас», — цытуе Ірыну Касцевіч БелТА.

Развіццё валанцёрскага руху ў краіне набірае абароты, але існуючыя вынікі — гэта не мяжа, упэўнена міністр. «На злёце кожны рэгіён прадставіў свае праекты. Мэта — паказаць новае. І гэта новае павінна быць не толькі ў тым рэгіёне, дзе зарадзілася, але і максімальна ісці па ўсёй краіне».

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі выказваюць глыбокія спачуванні Круглянін Уладзіміру Станіслававічу, начальніку дзяржаўнай установы «Галоўнае гаспадарчае ўпраўленне» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

ТОНЫ СОЛІ ДЛЯ ДАРОГІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Да халоднага сезона камунальнікамі нарыхтавана каля 200 тысяч тон пясчана-салянай сумесі, для аператыўнага рэагавання на надвор'е сфарміравана 725 аварыйных-аднаўленчых брыгад колькасцю 3400 чалавек. У залежнасці ад інтэнсіўнасці снегападаў на барацьбу з іх наступствамі за суткі выходзяць ад 900 да 3000 адзінак тэхнікі. Створана кругласутачная дыспетчарская служба, куды можна звярнуцца па нумарах: 8 (017) 3203936 (гар.) і 8 (044) 5694269 (маб.). На рэспубліканскіх дарогах вывешаны адзіны нумар тэлефона 125 для дапамогі. Усталяваны сезонныя знакі 1.33 (з таблічкамі) на ўчастках, дзе найперш можа ўтварацца наледзь.

Перадзімовыя ўказы, дагаворы, трэніроўкі

Рыхтуючыся да зімы, камунальнікі правялі наступныя віды работ. Зроблены тэхнічны агляд і сезоннае абслугоўванне тэхнікі, якая задзейнічана ў зімовы перыяд. На прадпрыемствах выданы ўказы, адпаведна з якімі прызначаны асобы, адказныя за правядзенне работы па своечасовай і якаснай ачыстцы ад снегу вуліц, праезных частак, тратуараў, прыпыначных пунктаў і дваро населеных пунктаў краіны, а таксама асобы, за якімі замацавана тэхніка. Заключаны дагаворы з пабочнымі арганізацыямі для ўтрымання ў належным стане вулічна-дарожнай сеткі ў выпадку пазаштатных сітуацый, якія выкліканы багатымі ападкамі, расказаў **Аляксей ФІЛАНОВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства ЖКГ:**

— На 1 снежня на балансе прадпрыемстваў сістэмы ЖКГ знаходзіцца звыш 3700 адзінак тэхнікі для зімовага ўтрымання. Гэта 596 пескараскідальнікаў і салеразмеркавальнікаў, 1582 адзінкі снегаўборачнай тэхнікі, 682 пагрузчыкі снегу, 848 самазвалаў і трактароў. З пачатку снегападаў ужо расходавана 74 тысячы тон супрацьгалалёдных сумесяў, запас такіх матэрыялаў папаўняецца.

Адбываюцца таксама практычныя трэніроўкі і вучэнні з мэтай недапушчэння надзвычайных сітуацый. Адпрацаваны пытанні апавяшчэння і збору кіраўнікоў і работнікаў прадпрыемстваў. Праверана спраўнасць і ўкамплектаванасць тэхнікі, работа дыспетчарскіх службаў, удакладнены спісы рабочых для прыцягнення да працы ў выпадку надзвычайных

сітуацый, у тым ліку ў выхадныя і святочныя дні. Праверана ўкамплектаванасць аварыйных брыгад і аўтамабіляў, дадаў ён.

Не едзь па ўзбочыне і ў снегапад!

Павышаецца ўзімку і нагрузка на дарожнікаў. 3650 кіламетраў зімовых дарог Мінскай вобласці абслугоўвае «Мінскаўтадар-Цэнтр». Прадпрыемства мае 140 пескасолеразмеркавальнікаў, 123 трактары з навясным снегачышчальным абсталяваннем, 17 грэйдараў, 59 пагрузчыкаў, 7 ротараў.

— Патрабаванні да гарадскіх дарог і вуліц па бяспецы рэгламентуюцца ў Беларусі ТКП 100 аб парадку арганізацыі і правядзенні работ па зімовым утрыманні аўтамабільных дарог і СТБ 1291, які вызначае патрабаванні да эксплуатацыйнага стану аўтадарог, — зазначыў **Дзмітрый ДЗЕМІДОВІЧ, начальнік упраўлення выканання работ і ўтрымання дарожнай сеткі прадпрыемства «Мінскаўтадар-Цэнтр».** *— Сёлета найбольш моцнымі пакуль сталі снегапады 23 лістапада і ў перыяд з 2 на 3 снежня. 23 лістапада са 145 пескасолеразмеркавальнікаў было задзейнічана 116, са 123 трактароў — 45, з 59 пагрузчыкаў — 40. Ротары і грэйдары не спатрэбіліся. У другі снегапад тэхнікі спатрэбілася менш.*

Такім чынам, на 100 працэнтаў тэхніку пакуль не задзейнічалі, а да сезона нарыхтавалі 73 929 тон хіміка-фракцыйных матэрыялаў і 48 045 тон хімічных рэагентаў, удакладніў начальнік упраўлення:

— Калі здарыўся «Хаўер», мы таксама працавалі ў напружаным рэжыме. Аднак, каб падобнае не паўтарылася, трэба выключыць сітуацыі, калі транспарт рухаецца акрамя асноўных палос яшчэ і па ўзбочыне. Дарогі, дзе аўто ехалі такім чынам, пацярпелі больш за іншыя, бо вадзіцелі тым самым блакіравалі нашу дарожную тэхніку ў складзе транспартнага патоку.

Пры такіх прагнозах грузавы транспарт з патокаў трэба выключаць, дадаў Дзмітрый Дземідовіч. Згодна з культурай кіравання, падчас снегападаў вадзіцелі-дальнабойшчыкі адстойваюцца на пляцоўках, а ў шлях выпраўляюцца, калі прайшла снегачышчальная тэхніка:

— Калі не будзе неабдуманых выездаў у снежнае надвор'е, а рухацца кіроўцы будуць згодна з правіламі руху па-за межамі населеных пунктаў (па крайняй правай паласе), праблем не будзе.

Грузавая тэхніка (фуры і бензавоз), якія рухаліся ў моцны снегапад, ужо сталі ў гэты сезон (30 лістапада) прычынай вялізнай «пробкі» больш як на дзесяць кіламетраў, якая пачыналася на Партызанскім праспекце і цягнулася ажно да развязкі Сосны — Стайкі. На ўчастак, які звычайна пераадольваўся за 15 хвілін, трэба было затраціць 1,5 гадзіны, бо вялікагрузы проста захраслі і звузілі шлях да дзвюх і нават адной (з-за бензавоза) паласы.

Снежныя кубаметры і інгібітары

У Мінску за зімовымі дарогамі сочаць кругласутачна. У сталіцы падрыхтавана для работы ў штатным рэжыме каля 700 адзінак спецыялізаванай тэхнікі і каля 800 прыборшчыкаў тэрыторый. Падчас снегападаў на прыборцы і вывазе снегу працавала больш як 900 адзінак тэхнікі і звыш 900 прыборшчыкаў. Нарыхтавана больш за 8 тысяч тон тэхнічнай солі і 37 тысяч тон пясчана-салянай сумесі, расказаў **Арцём ГАНЧАР, намеснік генеральнага дырэктара прадпрыемства «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама»:**

— Да пачатку сезона была праведзена трэніроўка па рабоце саляразмеркавальных механізмаў на мінімальныя нормы расходу супрацьгалалёдных матэрыялаў. З пачатку зімы расходавана ўжо больш за 26 тысяч тон тэхнічнай солі і 13,5 тысячы тон пясчана-саляных сумесяў. У месцы часовага захоўвання вывезена больш як 120 тысяч м³ снегу, з іх 91 тысяча — толькі за папярэдні снегапад.

Праезд па дарогах мясцовага значэння Мінскай вобласці забяспечваецца сіламі прадпрыемства «Мінскаблдарбуд», на балансе якога звыш 16 тысяч аўтадарог. Перад пачаткам сезона 540 адзінак спецыялізаванай тэхнікі былі атэставаны, арганізавана кругласутачная дыспетчарская служба, выкананы

ямачны рамонт на плошчы 282 тысячы м², падзяліўся **Валянцін ВОЎЧАНКА, начальнік аддзела ўтрымання дарожнай сеткі і бяспекі дарожнага руху прадпрыемства «Мінскаблдарбуд»:**

— Усе звароты грамадзян мы адпрацоўваем, выязджае спецыялізаваная тэхніка. У пазаштатных сітуацыях мы можам прыцягваць у дапамогу каля 640 адзінак тэхнікі сельгаспрадпрыемстваў і вытворчых арганізацый.

НАН Беларусі распрацавала спецыяльны інгібітар (замест звычайнай пясчана-салянай сумесі), мэта якога — зменшыць шкоды ўплыў на зялёнае навакольле і металічныя агароджы. Яго прымяненне адпрацоўваецца на вуліцах Свярдлова і Ульянаўскай. На гэтых участках вывешаны ўзоры металічных і жалезабетонных канструкцый, а вучоныя з інстытута батанікі вывучылі стан раслін (да канца лета яны дадуць заключэнне, ці змяншае ўплыў на зялёныя насаджэнні новы рэагент).

Пры гэтым варта памятаць, што ён будзе ў 2,5 раза даражэйшы, чым звычайны, удакладніў Дзмітрый Дземідовіч:

— Запасаў хларыду натрыю (солі) у нас хопіць не на адну сотню гадоў, і, акрамя каразійнага ўплыву на метал і ўздзеяння на расліны, варта думаць, як гэта адаб'ецца на хатніх гадаванцах, якія гуляюць па вуліцах.

Абмежаванне ўезду і хуткасці

Падчас правядзення прыборачных работ на дарогах дапамогу ў суправаджэнні калон снегаўборачнай тэхнікі і эвакуацыі транспартных сродкаў аказваюць супрацоўнікі ДАІ.

— У Мінску з улікам умоў надвор'я дзейнічае план «Завіруха». Дзяржаўтаінспекцыя гатовая да пазаштатных сітуацый пры ўскладненні ўмоў надвор'я, у тым ліку да абмежавання ўезду ў горад буйнапамернай тэхнікі і абмежавання руху транспарту ў цэлым. Ёсць у сталіцы праблемныя пункты, звязаныя з асаблівасцямі праезнай часткі, напрыклад з ухілам дарогі. Там ставяцца абмежаванні хуткасці, — падзяліўся **Дзяніс ЛЕВАНОВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.**

Ён заклікаў жыхароў з разуменнем ставіцца да прыманых мер і ўтрымацца ад паездак на аўто ў складаных умовах, карыстацца метро, не пакідаць машыны ўздоўж вуліц, асабліва на доўгі час (па такіх аўто будзе праводзіцца асобная работа). Графікі прыборкі вуліц і двароў будуць публікавацца, і аўтаўладальнікаў просяць улічваць гэта. А калі транспарт забралі, бо ён замінаў чысціць вуліцы, то даведацца, куды, — можна па нумары 102.

Ірына СІДАРОК.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Найбуйнейшы штат Бразіліі змагаецца з наступствамі наймацнейшай засухі

Амазонас — найбуйнейшы штат Бразіліі — змагаецца з наступствамі экалагічнай катастрофы пасля працяглай засухі, паведаміла France24. Адзначаецца, што наймацнейшая ў гісторыі рэгіёна засуха наступіла пасля некалькіх тыдняў без дажджу. У многіх населеных пунктах Бразіліі адзіным сродкам перамяшчэння з'яўляюцца лодкі. У выніку абмялення водных шляхоў людзі аказаліся адрэзанымі ад знешняга свету. Рэкі высахлі з прычыны змены клімату і ўздзеяння кліматычнай з'явы Эль-Ніньё. Мясцовыя ўлады аб'явілі надзвычайнае становішча ва ўсіх 62 гарадах штата. Пацярпелі каля 152 тысяч сем'яў, ці каля 600 тысяч чалавек. Улады краіны імкнуцца даставіць ежу і ваду тысячам жыхароў, якія аказаліся ў ізаляцыі.

Налета рахункі за электраэнергію ў Вялікабрытаніі працягнуць расці

Цэны на энерганосьбіты ў Вялікабрытаніі працягнуць расці і налета, паведаміла «Сіньхуа». Паводле інфармацыі Упраўлення рынкаў газу і электраэнергіі Вялікабрытаніі (Ofgem), у першым квартале 2024 года мяжа максімальных дапушчальных цэн на энерганосьбіты ў Вялікабрытаніі павялічыцца на пяць працэнтаў, у выніку чаго рахункі для тыповай дварагаспадаркі дасягнуць 1928 брытанскіх фунтаў (\$2415) у год. На дадзены момант кошт усталяваны на ўзроўні 1834 брытанскіх фунтаў (\$2311). Зацверджаны ўладамі план амаль поўнасцю абумоўлены ростам цэн на міжнародным аптовым рынку энерганосьбітаў, а таксама нестабільнасцю фінансавай палітыкі і наступствамі глабальных сусветных падзей, паведамляюць прадстаўнікі Ofgem. Па словах генеральнага дырэктара Ofgem Джонатана Брырлі, у цяжкі для Вялікабрытаніі час нават мінімальнае павелічэнне рахункаў пацягне ўзрушэнне сярод насельніцтва.

Найстарэйшай жывёле на Зямлі споўніўся 191 год

Гіганцкая чарапаха па імені Джонатан, якая жыве на востраве Святой Алены, адзначыла свой 191-ы дзень нараджэння. Пра гэта паведаміла Euronews. Джонатан не толькі найстарэйшая жывая наземная жывёла ў свеце, але і самы стары з калі-небудзь зарэгістраваных прадстаўнікоў класа рэптылій. Яго ўзрост з'яўляецца прыблізным. Калі Джонатана прывезлі з Сейшэльскіх астравоў на востраў Святой Алены ў 1882-м, ён быў цалкам сталым, што для яго віду азначае не менш за 50 гадоў. Таму навукоўцы мяркуюць, што Джонатан нарадзіўся прыкладна ў 1832 годзе. Хоць, на іх думку, ён можа быць і старэйшым. Ветэрынар Джо Холінз распавёў прадстаўнікам Кнігі рэкордаў Гінэса, што ў Джонатана няма ніякіх прыкмет «запаволення жыцця». Чарапаха страціла нюх і практычна аслепла з-за катаракты, але апетыт у яе застаецца выдатным. На востраве Святой Алены Джонатан з'яўляецца нацыянальным здабыткам. Ён адлюстраваны на рэверсе мясцовай манеты ў пяць пенсаў. Да 2021-га тытул самай найстарэйшай жывёлы на зямлі належаў прамяністай чарапасе Туі Маліле, якая дажыла да 188 гадоў.

НЕ СЯДЗІЦЦА Ў ХАЦЕ?

ЛЫЖЫ, ЦЮБІНГ, СНАЎБОРД

Гэтыя варыянты, як кажуць, ляжаць на паверхні — снегу шмат. Турыстычная сфера краіны падрыхтавалася да такога развіцця падзей, ды і ўвогуле да навагодняга сезона.

— У гэтым годзе ўсіх ахвотных чакае шмат зімовых атракцыў ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, — адзначае **дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме Дзмітрый МАРОЗАЎ.**

Заўважым, што атракцыі ў турызме — гэта не проста нейкія лакацыі або экскурсіі, а цэлая сістэма мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне ў турыста яркіх эмоцый і незабыўных уражанняў. Іншымі словамі, тое, дзеля чаго чалавек пакідае свой дом і адпраўляецца ў турыстычную паездку. Бо любы турызм — з'ехалі вы на край свету ці ўсяго за 50 кіламетраў — гэта ў першую чаргу эмоцыі.

Але пачнём якраз з таго, што «на паверхні», — з зімовых відаў актыўнасці, якія не патрабуюць далёкіх паездак. Інфармацыю аб лыжных трасах паблізу ад вашага населенага пункта можна атрымаць на парталах belarustourism.by або belarus.travel. Зрэшты, і без падказак любому прыйдуць на розум Сілічы, Лагойск, Раўбічы, а мінчане ўспомняць Сонечную даліну ў Курасоўшчыне.

— Але гэтымі знакамітымі комплексамі спіс не абмяжоўваецца, — дадаў Дзмітрый Марозаў. — Ва ўсіх рэгіёнах на базе розных спартыўных комплексаў падрыхтаваны для турыстаў аб'екты зімовага адпачынку з магчымасцю размяшчэння і пракату інвентара.

Абсталяваны таксама ў краіне дзясяткі месцаў для катання на цюбінгах, адзначыў спецыяліст. Ёсць тыя, дзе цюбінг можна ўзяць на пракат (платныя), а таксама бясплатныя, куды можна прыйсці з уласным цюбінгам. На ўсіх гэтых аб'ектах строга вытрымліваюцца правілы тэхнікі бяспекі, запэўнілі спецыялісты. У прыватнасці, у Мінску абсталявана ў агульнай складанасці 14 лыжных трас і 23 горкі для катання на цюбінгах, дадала **начальнік аддзела па развіцці турызму Інфармацыйна-турыстычнага цэнтра «Мінск» Ганна САЖНЕВА.**

— За бяспеку на абсталяваных горках для катання на цюбінгах у сталіцы адказваюць камунальныя службы, «Зелянбуд», ЖЭУ і «Рамаўтадар», — сказала яна.

Не забыты і аматары паляўнічага турызму: у гэтым зімовым сезоне свае паслугі ў розных рэгіёнах Беларусі прапануюць 136 дамоў паляўнічага і рыбака.

ШАНЦ УБАЧЫЦЬ ЗУБРА

Цяпер — выдатны час для экатурызму, падкрэсліў Дзмітрый Марозаў. Нацыянальныя паркі і іншыя прыродаахоўныя аб'екты прапануюць мноства самых розных экскурсій і камфортнае гасцінічнае размяшчэнне. Менавіта зімой, звярнуў увагу спецыяліст, вялікая верагоднасць убачыць зуброў — брэнд нашай краіны — ва ўмовах дзікай прыроды. У гэтую пару буйныя жывёлы выходзяць на палі ў пошуках травы ў светлавы час, чаго ўлетку не робяць.

— У Беларусі ёсць сапраўды ўнікальныя месцы, у прыватнасці,

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Палескі радыяцыйна-экалагічны запаведнік, — сказаў кіраўнік Нацыянальнага агенцтва па турызме.

Там, напрыклад, зроблены назіральныя пляцоўкі, якія дазваляюць турыстам, знаходзячыся ў бяспецы, апынуцца сярод статка зуброў, распавёў ён. Выправіўшыся туды зімой, вы гарантавана сустрэнеце гэтых волатаў, як і іншых унікальных прадстаўнікоў фаўны — напрыклад, чорных буслоў і нават каня Пржэвальскага. Унікальнасць экасістэмы, якая склалася там, абумоўлена адсутнасцю на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў фактару ўплыву чалавека, і такога аб'екта больш няма не толькі ў нашай краіне, але, мабыць, у цэлым у Еўропе.

Праўда, вандраванне туды патрабуе ад турыста некаторай арганізацыйнай дзейнасці. Немагчыма прыехаць у запаведнік дзень у дзень і запатрабаваць экскурсію — спіс турыстаў павінен быць у арганізатараў тура загадзя. Таксама забаронена перамяшчацца па тэрыторыі запаведніка на ўласным транспарце — толькі на транспарце запаведніка.

— Але рэгламент дакладна прапісаны, запаведнік распісаў усе алгарытмы, і ніякіх праблем у турыстаў не ўзнікае, — запэўніў спецыяліст.

Можна звязацца напрамую з турыстычным аддзелам запаведніка або дзейнічаць праз турыстычныя кампаніі, якія прапануюць дадзеную экскурсію, адзначыў ён.

Зрэшты, убачыць зуброў можна і ў Белавежскай пушчы, заадно пабываўшы ў маёнтку Дзеда Мароза. І лепш за ўсё планаваць тур не на адзін, а на некалькі дзён, падкрэслілі спецыялісты сферы турызму.

— За некалькі гадзін турысты паспяваюць наведаць толькі аглядную экскурсію па пушчы, маёнтак Дзеда Мароза і вальеры з жывёламі. Шэраг цікавых аб'ектаў часта застаецца «за кадрам». Гэта і пушчанскі хутар, і археалагічны музей, і многае іншае, — распавёў Дзмітрый Марозаў.

МІФЫ І ЛЕГЕНДЫ

Уласна, турыстычныя падзеі пачынаюцца ўжо цяпер, і да навагодняга наплыву турыстаў можна паспець без таўканіны і спешкі атрымаць асалоду ад іх. Дарэчы, на belarus.travel запускаецца каляндар падзей, разлічаны найперш на тых, хто падарожнічае самастойна і сам плануе свой маршрут. Мерапрыемствы можна адсочваць як па даце, так і па лакацыях. Падборка сабрана па розных відах турызму па ўсёй краіне, ёсць магчымасць згенераваць уласны спіс славутасцяў. База прывязана да маршрутызатара — гэта дазваляе пракласці аптымальны маршрут. Больш за тое, у радыусе 20 км ад пракладзенага маршруту сістэма прапануе дадатковыя лакацыі і падзеі, якіх, заўважым, у пераднавагоднія дні ў краіне запланавана шмат.

Цяпер — выдатны час для экатурызму. Нацыянальныя паркі і іншыя прыродаахоўныя аб'екты прапануюць мноства самых розных экскурсій і камфортнае гасцінічнае размяшчэнне. І менавіта зімой вялікая верагоднасць убачыць зуброў — брэнд нашай краіны — ва ўмовах дзікай прыроды.

Цікавыя мерапрыемствы чакаюць турыстаў перад Калядамі, у перыяд Адвэнту, расказаў Дзмітрый Марозаў. Шырока прадстаўлена міфалагічная і абрадавая часткі свята. Так, напрыклад, Вісбескі рэгіён (Паазер'е) прапануе ўсім ахвотным сустрэцца з Зюзяй (нашым спрадвечным і аўтэнтычным Дзедам Марозам). Зрэшты, і ў гэтай сферы кожны рэгіён знойдзе чым здзівіць гасцей. Планаваць навагоднія «вакацыі» лепш загадзя: пасля 15 снежня не так проста будзе знайсці для размяшчэння месца з начлегам, папярэдзілі спецыялісты сферы турызму.

САНАТОРЫІ І ПРАФІЛАКТОРЫІ

А вось куды вы сапраўды — ну, амаль дакладна — спазніліся, дык гэта на санаторна-курортнае лячэнне. Амаль таму што месцы яшчэ ёсць, але іх мала і яны растаюць з хуткасцю вясновага снегу.

— Ужо пачынаючы з верасня ішло актыўнае браніраванне навагодняга і каляднага перыяду, і сёння каля 94 % ад агульнай магутнасці санаторна-курортных арганізацый ужо забраніравана, — адзначыў **намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Аляксандр ЦАЙ.** — На снежань у цэлым забраніравана каля 81 % месцаў, 65 % забраніравана на студзень і каля 50 % — на люты. Ідзе браніраванне на летнія месяцы.

І ўсё ж здраўніцы яшчэ не запоўнены на 100 % і можна паспець выкупіць пуцёўкі, каб з карысцю правесці навагоднія дні. Санаторыі распрацавалі шэраг медыцынскіх праграм, разлічаных на знаходжанне ад 3 да 14 дзён. З медыцынскага пункту гледжання 14 дзён пераважныя, але і за тры дні можна адпачыць і стаць здаравейшымі. Карыстаюцца попытам і пуцёўкі выхаднога дня, расказаў спецыяліст.

Санаторна-курортныя арганізацыі нашай краіны — шматфункцыянальныя лячэбна-аздараўленчыя комплексы з шырокім пералікам медыцынскіх паслуг, разнапланавай арганізацыяй вольнага часу і харчавання, у тым ліку па тыпе шведскага стала, што прымальна для грамадзян еўрапейскіх краін, адзначыў ён. Калі за мяжой развіваецца спа-кірунак, у нас лячэнне ажыццяўляецца па профілі захворванняў і аказваецца шырокі пералік медыцынскіх працэдур, у тым ліку дыягнастычных паслуг.

— У гэтым годзе за 9 месяцаў лячэнне і аздараўленне прайшлі больш за 1 млн 157 тысяч чалавек, выручка ад рэалізацыі паслуг адносна аналагічнага перыяду мінулага года ўзрасла на 30 % і склала больш за 850 млн рублёў, — паведаміў Аляксандр Цай.

У тым ліку лячэнне і аздараўленне ў здраўніцах Беларусі прайшлі больш за 161 тысячу замежных грамадзян. У навагодні перыяд чакаецца, што санаторна-курортнае лячэнне пройдуць яшчэ каля 24 тысяч чалавек, дадаў спецыяліст. І калі звычайна суадносіны замежных грамадзян і грамадзян Беларусі ў сістэме айчынных санаторыяў складае прыкладна 30 % і 70 % адпаведна, то ў навагодні перыяд колькасць замежнікаў складзе каля 45 % (або 11 тысяч чалавек).

Святочныя праграмы ў санаторыях краіны ўжо распрацаваны, ёсць што прапанаваць нават самаму прыдзірліваму наведвальніку, запэўніў ён. Кошт навагодняга банкета з канцэртнай праграмай складзе сёлета каля 226 рублёў, а сярэдні кошт аднаго дня знаходжання ў санаторыі ў навагодні перыяд — 115 рублёў.

А КАЛІ НІКУДЫ НЕ ЕХАЦЬ?

Можна і не ехаць, а проста выйсці з дому і прайсціся па родным горадзе. Паўдзельнічаць у анімацыйных праграмах, прагуляцца па зімовых зонах гасціннасці, па гістарычным цэнтры вашага населенага пункта (гістарычныя цэнтры ўжо ўпрыгожваюцца да Новага года і змяняюцца літаральна на вачах).

Сталіца, як ёй і належыць, пачынае красаваць у ліку першых. Каляндар святочных і турыстычных сталічных падзей быў сфарміраваны яшчэ ў сярэдзіне кастрычніка, заўважыла Ганна Сажнева. Шукаць яго варта, дарэчы, на партале minsktourism.by.

— Штогод мінчане і госці сталіцы атрымліваюць ад роднага горада навагоднія сюрпрызы. Мінулагодняя інтэрактыўная ёлка ў Верхнім горадзе многіх здзівіла. У гэтым годзе Верхні горад таксама паўстане казачным і новым. Напэўна, наведвальнікаў уразіць навагодні вернісаж, які дазваляе ў суправаджэнні віртуальнага экскурсавода здзейсніць падарожжа па вядомых карцінах, — расказала спецыяліст.

Асноўнымі лакацыямі свята ў сталіцы стануць пляцоўка каля Палаца спорту, галоўная ёлка на Кастрычніцкай плошчы і Верхні горад. Можна наведаць начную экскурсію па навагоднім Мінску, яна будзе цікавая не толькі гасцям горада, але і карэнным мінчанам. Што да турыстаў, то менавіта ад гэтай экскурсіі, як правіла, мноства захопленых водгукаў, расказала Ганна Сажнева. Акрамя таго, высокіх адзнак гасцей удастойваюцца спа-атэлі сталіцы і сетка ўстаноў «Аква-Мінск».

Ну, а да паслуг мінчан гэтай зімой — 31 каток і 31 хакейная каробка, а таксама экасцежкі ў кожным раёне горада. Дарэчы, паркі сталіцы таксама прапануюць наведвальнікам шэраг цікавых праграм і лакацый. І хоць сезон атракцыёнаў даўно скончыўся, там будзе чым заняцца ў навагоднія дні і дзецям, і дарослым.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ:

«МАДЭЛІ ЖЫЦЦЯ ГРАМАДСТВА МЫ ПАВІННЫ ВЫЗНАЧАЦЬ САМІ Ў РАМКАХ НАШАЙ ДУХОЎНАЙ СЛАВЯНСКАЙ ТРАДЫЦЫІ»

Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы пра стаўленне да санкцый і знешняга ціску, філасофію расійска-беларускіх адносін і якасць беларускіх тавараў

Зусім нядаўна ў Маскве прайшло пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, дзе падвялі вынікі развіцця інтэграцыйнага супрацоўніцтва Расіі і Беларусі і вызначылі новыя арыенціры на перспектыву 2024—2026 гадоў. Якім будзе гэта супрацоўніцтва? У якіх сферах інтэграцыйныя працэсы ідуць найбольш актыўна, а што патрабуе большых намаганняў? Чаго чакаць у адносінах Расіі і Беларусі ў наступным годзе, улічваючы ўсё яшчэ няпростую грамадска-палітычную кан'юнктуру? Якія перспектывы адкрыліся для беларускіх навукоўцаў дзякуючы саюзным праграмам і ці быць сумеснаму Універсітэту высокіх тэхналогій? Якую ролю ў інтэграцыйных працэсах адводзяць моладзі? Пра гэта падчас прэстура, арганізаванага пры садзейнічанні Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы і Міжнароднай медыягрупы «Россия Сегодня» расказаў журналістам, адказаўшы на іх пытанні Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў.

— Дзмітрый Фёдаравіч, у Беларусі 2024-ы аб'яўлены Годам якасці. А на што будзе арыенцір у Саюзнай дзяржаве ў наступным годзе? У якіх кірунках сумесная дзейнасці можна зрабіць акцэнт на якасці?

— Год якасці найперш для вытворцаў, тэхнолагаў, пастаўшчыкоў прадукцыі, сыравіны, каб для спажыўца яна была на належным узроўні. Але я бачу гэта больш шырока і абсалютна ў ўпэўнены, што і 2024-ы, і наступныя павінны быць гадамі якасці, нават калі яны фармальна не названыя так кіраўнікоў беларускай ці расійскай дзяржавы. Гэта не толькі якасць прадукцыі, але і якасць нашай работы, а ў высокім сэнсе — духоўная якасць нашых адносін, раўнапраўе, шчырасць, надзейнасць, чалавечая прыхільнасць адзін да аднога, дабро і адкрытасць да ўсіх тых краін, з якімі ў нас паранейшаму сяброўскія адносіны. Ну і пасыл да ўсіх тых, хто аказвае на нас ціск, што гэта бесперспектыўны шлях і ён толькі аб'ядноўвае з намі народы тых краін, улады якіх такую жорсткую лінію абралі ў адносінах да Беларусі і Расіі. Нашы краіны вырашаюць свае праблемы самастойна, без указкі і ціску звонку. І духоўныя каштоўнасці, мадэлі жыцця грамадства мы мусім вызначаць самі ў рамках нашай духоўнай славянскай традыцыі, а не слухаць, што нам падказваюць рэжымы палітычнай моды і аднамомантнай кан'юнктуры.

Вяртаючыся да Года якасці, скажу, што днямі з кіраўніком Брэсцкай вобласці Юрыем Шулейкам пабывалі ў беларускім павільёне ВДНГ. Даручэнне Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі асучасніць павільён, дадзенае ў свой час, выканана ў поўнай меры. У краме яблыку няма дзе ўпасці. Мы разам з дырэктарам павільёна наведалі яго. Ідзе насустрач жанчына, я спытаў, адкуль яна. «Мы з Хабараўска. Толькі што пабывалі ў Брэсце і Мінску, зараз збіраемся дадому, заехалі закупіць якасных беларускіх прадуктаў». У руках яна трымае дзве сумкі. Пытаюся: «А ці ёсць у Хабараўску прадукты?» — «Ёсць, але ўзялі беларускіх, каб пачаставаць сяброў і блізкіх». Вось прамы індыкатар таго, што гэта Год якасці і цяпер, і ў наступным годзе. І вы ведаеце, як мы ставімся да харчовай прадукцыі, што трапляе на сталы ў Маскве.

— Бягучы год для Саюзнай дзяржавы быў насычаны, праведзена шмат мерапрыемстваў. Якія вынікі можна падвесці ў эканамічным плане? І чаго чакаць у наступным годзе, улічваючы ўсё яшчэ няпростую грамадска-палітычную кан'юнктуру і санкцыі?

— Тыя пазіцыі, якія абазначаюць і Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, і Уладзімір Уладзіміравіч Пуцін, мы павінны успрымаць як наказ кожнаму расіяніну і беларусу. Навошта чакаць нарастання ціску ці яго паслаблення? Нам трэба разам спакойна і дакладна працаваць пад свае планы. А яны нядаўна зацверджаны на пасяджэнні саюзнага Саўміна. 22 праграмы з 28 цалкам рэалізаваны, падпісаны пратаколы аб іх выкананні. За два гады рэалізавана больш за 900 мерапрыемстваў, якія забяспечылі выкананне гэтых праграм.

Асноўныя сярод іх — фарміраванне адзінай прамысловай палітыкі, палітыкі ў аграсферы, збліжэнне работы цэнтральных банкаў, найперш па забеспячэнні высокай якасці фінансавых паслуг і абароны інтарэсаў укладчыкаў, якімі з'яўляюцца грамадзяне Беларусі і Расіі. Мы з захапленнем успрынялі цырымонію перадачы Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку сертыфіката аб уводзе ў строй Беларускай АЭС. І важна, што Аляксей Яўгенавіч Ліхачоў там, дзе напісана «гарантыя 60 гадоў», ручкай выправіў «ад 60 гадоў». Беларусь сёння, дзякуючы задуме, якую ў 2012 годзе два нацыянальныя лідары абмеркавалі і зацвердзілі, стала краінай мірнага атама. І адна з саюзных праграм якраз прысвечана бяспецы і фарміраванню энергарынку.

Мы па-ранейшаму павінны забяспечваць роўныя правы грамадзян Расіі і Беларусі ў сацыяльнай сферы. Па дзясятках гэтых кірункаў вельмі шмат зроблена. І эстафета гэтай работы падхоплена: зацверджаны праект дэкрэта Вышэйшага дзяржсавета аб напрамках на наступныя тры гады, іх 11. І бадай упершыню абазначаны культурна-гуманітарныя кірункі, якіх раней у дакументах урада мы і не чакалі бачыць. Была эканоміка, фінансы, пастаўкі канкрэтных аб'ёмаў прамысловай прадукцыі. І тое, што сёння ўрад гатовы бачыць сваім прыярытэтам гуманітарнае супрацоўніцтва, — каласальны прарыў. Гэта пазіцыя Міхаіла Уладзіміравіча Мішусціна, які незадоўга да пасяджэння ўрада правёў стратэгічную сесію, прысвечаную тэме адносін Расіі і Беларусі па ўсіх магчымых напрамках. І важна, што гэта падтрымаў Раман Аляксандравіч Галоўчанка і члены беларускага ўрада.

Усё гэта робіцца для выканання даручэнняў і ў падтрымку тых падыходаў, якія абазначаюць кіраўнікі нашых дзяржаў. Гэта фундамент, філасофія, і на паперы ўсё можна прачытаць. А што нельга прачытаць на паперы, дык гэта характарыстыкі таго дыялогу, які стаў больш паспяховым, больш шчырым, з большым жаданнем чуць інтарэсы партнёра і яго запыт. Нейкія спрэчкі будуць заўсёды, але ў глабальным плане імкненне выйсці на вынік пацвярджаецца абодвума бакамі паслядоўна і безумоўна.

— Вялікая колькасць расійскіх дзелегацый прыязджала сёлета ў Беларусь і сустракалася з кіраўніком дзяржавы. Наколькі важнае такое міжрэгіянальнае супрацоўніцтва з пункту погляду будаўніцтва далейшых інтэграцыйных працэсаў Расіі і Беларусі?

— Не толькі расійскія дэлегацыі наведваюць Беларусь, прэм'ер Галоўчанка апошнім часам пабываў у 10 расійскіх рэгіёнах. Скажу, абапіраючыся і на свой вопыт кіраўніцтва рэгіёнам плошчай сем тысяч квадратных кіламетраў, — гэта плошча Іркуцкай вобласці. Мы заўсёды хацелі, каб «усе сцягі ў госці да нас». Зразумела, што рэгіён Усходняй Сібіры выбудоўваў адносіны перш за ўсё, з краінамі-суседзямі. І такая практыка-арыентаванасць кіраўнікоў суб'ектаў федэрацыі на ўзаемадзеянне з беларускімі рэгіёнамі дзейнічае паўсюль — 85 суб'ектаў федэрацыі з 89 маюць у тым ці іншым фармаце падпісаныя дакументы.

Гэта не проста факт статыстыкі, гэта сістэма адносін, абмеркаванне і выхады на канкрэтнае супрацоўніцтва: пастаўкі прадукцыі, асэнсаванне рэгіянальнага рынку — харчовага, прамысловага, лёгкай прамысловасці, гэта культурныя, гуманітарныя, адукацыйныя сувязі, турызм, лячэнне. Нягледзячы на тое, што пашпарты ў нас рознага колеру, беларусам можна ўладкоўвацца на работу ў Расіі без абмежаванняў. Калі вам хтосьці скажа, што гэта не так, гэта прамое парушэнне заканадаўства — нацыянальнага расійскага і Саюзнай дзяржавы.

Сёння магчымасцяў працаваць у рэжыме гарызантальных сувязяў — «суб'ект федэрацыі — рэгіён», «горад пабрацім — горад пабрацім» — нашмат больш. Раніцай размаўляў з кіраўніком Усходняй адміністрацыйнай акругі Масквы — у іх асабліве пагадненне з Магілёўскай вобласцю. Усе без выключэння адміністрацыйныя акругі Масквы маюць свае пагадненні з рэгіёнамі Беларусі. Ва ўрада Масквы ёсць пагадненне з урадам Беларусі аб асаблівых сувязях, як і ў кіраўніцтва Санкт-Пецярбурга. Было некалькі вялікіх форумаў на берагах Нявы з удзелам Рамана Аляксандравіча Галоўчанкі і Аляксандра Дзмітрыевіча Бяглова. Іншая справа, што мы павінны быць рэалістамі. Мы адзначаем поспехі, выніковасць, творчасць у адносінах, але мы павінны разумець, што трэба, каб уцягнуты былі не 50 членаў урада і апаратаў рэгіянальных міністэрстваў, а тысячы людзей.

— Падчас сустрэч з дэлегацыямі расійскіх рэгіёнаў Прэзідэнт Беларусі нацэльвае на тое, каб не стварацьдубліруючых вытворчасцяў, а ўзаемадапаўняць адзін аднаго на агульным рынку. У якіх сферах, на ваш погляд, на гэта маюцца перспектывы?

— У тым жа аўтамабілебудаванні зроблена многае, каб актывізаваць намаганні бакоў. Зразумела, што брэнды МАЗа і КАМАЗа арыентаваны на аднолькавыя сегменты, але ёмістасць рынку такая, што фактычна напружання ў адносінах нашых гігантаў не будзе. Мы бачым, што ёсць выніковасць ва ўзаемадзеянні новага штабу абароннай прамысловасці. Ёсць дамоўленасць селекцыянеру і генетыкаў, каб садзейнічаць павышэнню ўраджайнасці, якасці пагалоўя буйной рагатай жывёлы, малочнага статка, і яна ўжо цяпер іншая, чым была раней.

Сёння мы можам казаць пра рэалізацыю стратэгіі адзінага навуковага і тэхналагічнага развіцця Саюзнай дзяржавы да 2035 года. У 2019 годзе ў рамках пасяджэння Групы высокага ўзроўню з удзелам Уладзіміра Рыгоравіча Гусакова і Міхаіла Валянцінавіча Кавальчука абмяркоўвалі адносіны НАН Беларусі і Курчатаўскага інстытута. Прайшоў невялікі час, і сёння мы бачым, што Расійская акадэмія навук, Курчатаўскі інстытут, інстытуты і навуковыя цэнтры НАН Беларусі дэманструюць зусім іншую практыку адносін, чым была раней. Расіяне працягнулі руку беларускім вучоным, запрашаючы іх выкарыстоўваць навуковую інфраструктуру, у тым ліку ПІК-рэактар у ядзерным цэнтры ў Гатчыне фактычна бясплатна, каб не затрачваць сродкі з бюджэту Беларусі і гады на падрыхтоўку таго, што ўжо створана і дзейнічае на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы. Гэта найважнейшы задзел і індыкатар найбольшай гатоўнасці ўзаемадзейнічаць на прынцыпова іншым узроўні ў сферы высокіх тэхналогій, фундаментальных і прыкладных даследаванняў, і ў тым ліку па тэме ядзернай медыцыны.

Гэта тое, што відавочна, але ёсць і іншыя пытанні. Мы часам чуем меркаванне шэрагу ВНУ, што беларусы едуць у Расію вучыцца і застануцца там. Вернуцца, бо немагчыма сучасныя веды атрымліваць у закрытых аўдыторыях. Навуковыя веды не маюць геаграфічных межаў. І тут запрашэнне прадстаўнікоў акадэмічнай супольнасці Расіі і Беларусі да педагагічных працэсаў у ВНУ — адна з задач. Менавіта таму на пасяджэнні ўрада Саюзнай дзяржавы следам за абмеркаваннем плана рэалізацыі навукова-тэхналагічнага развіцця Саюзнай дзяржавы да 2035 года было дадзена даручэнне Міністэрству навукі і вышэйшай адукацыі Расіі і Міністэрству адукацыі Беларусі сумесна з Пастаянным камітэтам падрыхтаваць канцэпцыю ўдасканалення практыкі падрыхтоўкі спецыялістаў, перш за ўсё тэхнічнага профілю. І мы больш шырока гаворым аб заснаванні Універсітэта высокіх тэхналогій Саюзнай дзяржавы. І, канешне, мы хочам, каб работа бакоў па яго стварэнні была ў беларускай сталіцы.

— Якія маладзёжныя ініцыятывы чакаюцца ў 2024 годзе?

— Найперш хачу адзначыць праект «Цягнік Памяці», які адбудзецца і ў наступным годзе. Гэта задума Наталлі Іванаўны Качанавай і Валянціны Іванаўны Матвіенка, якія шмат увагі і душы надаюць ёй.

На пляцоўцы МІА «Россия сегодня» 6 снежня мы праводзім размову «Моладзь за Саюзную дзяржаву». Мы хочам, каб гэта сустрэча падтрымала традыцыю, якую мы заклалі летась, напярэдадні 23-годдзя падпісання саюзнага дагавора. Менавіта гэтыя маладыя людзі праз 25 гадоў будуць вызначаць сістэму адносін Расіі і Беларусі са знешнім светам.

Асабліва рыхтуемся правесці кадзецкую змену ў суворайскіх вучылішчах і кадзецкіх карпусах і класах — 80-годдзе вызвалення Беларусі проста абавязвае нас на гэтым зрабіць акцэнт. У параўнанні з 2021 годам мы павялічылі колькасць мерапрыемстваў культурна-гуманітарнай сферы з 21 да 34. Іх бюджэт вырас амаль на 50 %. Мы разумеем, што сёння важныя не толькі лічбы і рублі ці аб'ём выпушчанай прадукцыі, а танальнасць дыялогу і размова з моладдзю. Яны думаюць па-іншаму — і гэта іх права. Але ў іх няма права не быць грамадзянамі і не быць патрыётамі.

— Як будзе працягвацца праект «Бібліятэкі Саюзнай дзяржавы»?

— Мы хочам праз прызму лёсаў выдатных грамадзян Айчыны паказаць малавядомыя факты і дасягненні. Сімяон Полацкі выхоўваў царскіх дзяцей. Магчыма, яму не хапіла часу рэалізаваць усе сілы, якія хацеў укласці ў Пятра І, ва ўсялякім выпадку, ён заўсёды быў у дыялогу з царом Маскоўскім. Ён асветнік і чалавек, які задумаў стварэнне славяна-грэкалацінскай акадэміі. Сімяон Полацкі — тая фігура, якой мы хочам прысвяціць кнігу.

Казімір Семяновіч і Міхайла Ламаносаў — людзі рознага маштабу навуковых даследаванняў, але і эпохі розныя. Мы лічым, што можам аб'яднаць гэтыя лёсы аповедамі ў адным томе. Сёння мы кажам пра Івана Фёдарава, які быў дыяканам аднаго з храмаў маскоўскага Крамля, чалавек неверагоднай адукаванасці і мудрасці, пакінуў асаблівы след у гісторыі. Хтосьці кажа, што ён родам са Львова, але гэта толькі пацвярджае адзінства славянскага свету. Аповед аб лёсе Івана Фёдарава мы хочам падтрымаць аповедам пра Францыска Скарыну.

І, канешне, да 3 ліпеня мы хочам выдаць кнігу, прысвечаную ролі партызанскага руху, у тым ліку поспеху аперацыі «Багратыён». Гэтыя кнігі на выхадзе.

У наступным годзе выходзіць кніга «Космас як душа чалавецтва». Ідзе складаней, чым мы меркавалі, хоць здавалася б, тэма відавочная. Скажу шчыра, усе папярэднія кнігі запатрабавалі шмат душэўных сіл, спрэчак, пераадоленняў, але нам за іх не сорамна. Мы хочам, каб усе яны былі ў ранейшым фармаце: захоўваўся ўстаўны карашок, арнамент, вокладка была маляваная, а не фатаграфічная. Можна заўважыць, што няма ніякіх асаблівых спасылак на ўнёсак тых людзей, хто займаўся выданнем, бо найперш мы хочам казаць пра герояў гэтых кніг.

Запісала Алена КРАВЕЦ.
г. Масква.

Падпіска-2023

«ЧЫТАЦЬ «ЗВЯЗДУ» НЕ ТОЛЬКІ ЦІКАВА, АЛЕ І... ВЫГАДНА», —

кажуць гэта падпісчыкі, якія, дзякуючы газеце, помняць сваю родную мову, атрымліваюць шмат патрэбнай інфармацыі, вырашаюць праблемы, вырошчваюць багатыя ўраджаі, гатуюць смачныя стравы... А да ўсяго, аформіўшы падпіску на квартал, маюць магчымасць выйграваць каштоўныя прызы.

Фота Алены ДАЎЖАНОК.

Днямі свой кухонны камбайн атрымала пастаянная чытачка газеты Лізавета Іванаўна Мукасей са Слоніма. Яна (цяпер ветэран педагагічнай працы) па-ранейшаму шмат чытае, цікавіцца ўсім, што адбываецца ў свеце і краіне, апроч многага іншага, удзельнічае ў штогадовых міжнародных экспедыцыях «Дарога да Святыняў», падчас якіх праводзіць урокі беларускага пісьменства ў школах розных гарадоў і вёсак, расказвае моладзі пра гісторыю, пра нашых славутых землякоў...

Што цікава, прыз у звяздоўскай латарэі выпаў чытачцы якраз пад юбілей. «Калі з прыгожай круглай датай цябе віншуюць не толькі родныя ды блізкія, але і любімая газета — гэта вельмі прыемна!» — прызналася Лізавета Іванаўна.

Прыемна ёй. І газеце — што мае такіх падпісчыкаў.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

Чалавек — чалавеку

«Некалі гадавалі дзяцей і ні на што, здаецца, не скардзіліся»

...Валя хоць і была ў дэкрэтным адпачынку, але ўставала рана. У той дзень, як заўжды, зазірнула да сваіх малеч, асцярожна, каб не пабудзіць, паправіла на ложках коўдрачкі, ціхенька выйшла з пакоя. Потым, накінуўшы світку, выскачыла за парог, хуценька зачыніла дзверы, каб не напусціць у хату лішняга холаду. На падворку азірнулася — яшчэ раз прыкінула, што ёй трэба зрабіць, пакуль дзеці спяць. Па-першае — накарміць і адправіць на работу мужа (сняданак яна прыгатавала яшчэ з вечара), па-другое — расчысціць ад снегу дарожкі і агледзець гаспадарку, па-трэцяе — злазіць у склеп па бульбу, бо малыя любяць камякі, па-чацвёртае — нанасіць у хату вады і дроў, прапаліць грубку, вымыць посуд і падлогі (дзеці любяць гуляць на дыване)...

Пакуль планавала, муж пагаліўся, паснедаў і пайшоў на аўтобус. У яе хвілін дваццаць пайшло на тое, каб адкінуць з дарожак снег, каб зазірнуць у хату, але там было яшчэ ціха: малыя спалі. Значыць, можна зноў выскачыць на вуліцу — нанасіць дроў, схапіць вёдры, каб нацягаць вады. Яе ў той дзень трэ было шмат (хоць бы вёдзер з дзесяць, бо збіралася мыць бялізну), а студня — праз чатыры двары. На тое, каб выкапаць сваю, каля хаты, пакуль не хапала грошай.

...Перш чым пайсці да калодзежа, Валя зноў забегла ў дзіцячы пакой, каб упэўніцца, што малыя спяць.

Там жа, гледзячы на іх, падумала, што спачатку, мусіць, лепей злазіць па бульбу. Хуценька схапіла кашы, але рушыла з імі чамусьці не да склепа, а на вуліцу і далей да... студні.

Адтуль насустрач ёй з двума вёдрамі ішла сяброўка Зіна: павіталася, прыпынілася, сказала чамусьці, што бульбу саджаць яшчэ рана. «А пры чым тут бульба?» — не зразумела Валя і толькі цяпер заўважыла, што трымае ў руках... кашы. «Закруцілася я, сяброўчка, запрацавалася! — зарагатала Валя. — Так хачу ўсё паспець, пакуль дзеці спяць. Сабралася во ў склеп па бульбу, а пайшла па ваду»...

На падворак вярнулася, вядома ж, без яе (кашамі не наносіш), схапіла вёдры, подбегам, бо з хвіліны на хвіліну маглі прачнуцца дзеці, панеслася да студні.

...На той час мне, Валянціне і даўно ўжо Віктараўне, было 22 гады. Жыццё ў вёсцы вымагала шмат вельмі рознай штодзённай працы, бо хацелася, каб у хаце было цёпла, чыста і ўтульна, каб на стале — смачная, здаровая ежа, каб у шафе — напрасаваная бялізна, каб у гаспадарцы і на падворку — поўны парадак, каб прыгажосць пад вокнамі і ў гародзе...

А ў дапамогу ж тады ні пральных машын-аўтаматаў, ні мультыварак, мікрахвалёвак, ні электрычных духовак, ні пыласосаў, ні водаправода, ні газавага ацяплення, ні падгузкаў і дзіцячых садкоў, ні нават праваднога тэлефона, каб выклікаць тую ж «хуткую», калі малое, крый бог, захварэе...

Аднак мы, жанчыны, з радасцю гадавалі іх і ні на што, здаецца, не скардзіліся. А вось сённяшнія мамкі плачуцца, наракаюць: ім — цяжка...

Слухаючы гэта, я заўсёды ўспамінаю сябе 22-гадовую: такую, бывала, стомленую (бо круцілася як вавёрка ў коле!) і ў той жа час такую шчаслівую.

В. Бабко-Аляшкевіч,
в. Радкава, Салігорскі раён.

Ліст, што кліча ў дарогу

«МЫ АПЫНУЛІСЯ НІБЫ Ў МУЗЕІ, ДЗЕ ЛІТАРАЛЬНА ЎСЁ САПРАЎДНАЕ!»

На старонках «Звязды» часам з'яўляецца рубрыка «Уражанні». Якраз яны і прымусілі мяне сесці за гэты ліст. Шчыра і адразу: ніколі не думаў, што ў Беларусі ў нашым XXI стагоддзі, пасля ўсіх войн і трагедый, стане магчымым падарожжа ў часе: у чыстым полі ўбачыць капліцу, знайсці дот часоў Вялікай Айчыннай альбо «размеркаванья» па ўсім раёне распяцці з адной царквы. Аднак тут і цяпер не пра іх.

Калі коратка, то ў адзін прыгожы дзень мы з сябрамі вырашылі на машынах праехацца па нашым Палессі, наведаць у вёсцы Сінкевічы адзін з найстарэйшых драўляных храмаў — Георгіеўскую царкву. Знешне яна не так і ўражвала, але, апынуўшыся ўнутры, я без перабольшвання знямеў! Вам не перадаць, якая паўстала карціна! Машына часу перанесла мяне гадоў на 200—300 назад, я бачыў усё вачыма продкаў, што жылі тут многія пакаленні назад... Ды што там — я сам адчуваў сябе тым самым продкам-палешуком...

Тыя ж эмоцыі перажывалі і мае спадарожнікі. Яны казалі, што апынуліся нібы ў музеі, дзе літаральна ўсё аўтэнтычнае, дзе нават апошнія рамонты не знішчылі арэала ўсяго ўбранства.

І пры гэтым царква, на жаль і на жах, перажывае зусім не найлепшыя часы: ёй патрэбная рэстаўрацыя, прычым найхутчэй.

Мы з сябрамі і бацюшка, які прадставіў сканы, спадзяёмся на тое, што сродкі на яе знойдуцца. Магчыма, дзякуючы газеце.

Максім Казлоў,
г. Мінск.

Замест каментарыя

Апошнім часам у рэдакцыю прыйшлі два лісты на падобную тэму. І абодва, што называецца, паклікалі ў дарогу. З першай камандзіроўкі наш карэспандэнт ужо вярнуўся. У куткім часе, спадзяёмся, выедзе ў другую. А пакуль — шчыры дзякуй чытачам за лісты і... уражанні.

Дзякуй!

«Усіх прыезджых тут прымаюць як родных...»

Не вам казаць: сёння, як ні старайся, як ні беражы сваё здароўе, а захварэць можаш. І галоўнае — тады не застацца з бядой сам-насам, атрымаць правільнае лячэнне, прайсці рэабілітацыю. На яе (дзякуючы прафкаму) мне пашчасціла трапіць у санаторый «Іслач», многаму парадавацца і падзівіцца, з многімі пазнаёміцца.

Для таго каб аднавіцца пасля цяжкіх хвароб і аперацый (інсульту, інфаркту, выдалення міжпазваночнай грыжы і інш. у суправаджэнні родных і без іх, пры фінансавай падтрымцы прафсаюзных арганізацый і за свой кошт) у «Іслач» людзі едуць не толькі з беларускіх гарадоў і мястэчак, але і расійскіх — Масквы, Санкт-Пецярбурга, Смаленска, Калінінграда, Іркуцка, Мурманска — і з далёкага Баку (пяты раз!)... Многія прыязджаюць на адпачынак і цэлымі сем'ямі.

Распытваў, што іх прывабліве ў нашай «Іслачы»?

Па-першае, расказвалі, невысокія, у параўнанні з расійскімі, цэны на пуцёўкі. Па-другое, санаторый знаходзіцца ў непасрэднай блізкасці ад Мінска (зручна дабірацца), да таго ж — у вельмі прыгожым месцы (лес, возера, чыстае паветра)... Але галоўнае, мабыць, — уважлівае, чулае стаўленне медперсаналу: усіх прыезджых тут прымаюць як родных, заўсёды ўсё патлумачаць, ва ўсім дапамогуць.

Мне да сёння прыгадваецца былая медсястра гэтага санаторыя па імені Ева (прозвішча, на жаль, не запомніў), якая ўсім пацыентам казала: «Праходзьце ў кабіначку, кладзіцеся на кушэтачку...» і тым самым лячыла не толькі працэдурамі, але і сваёй увагай, узнімала настрой, вымушала верыць у лепшае.

На шчасце, вось гэтую традыцыю ў «Іслачы» ёсць каму прадаўжаць: вельмі ўважлівыя і клапатлівыя дзяўчаты працуюць «на солях». Перад працэдурай (а ўсе фізіятэрапеўтычныя тут можна праходзіць не толькі ў будныя дні, але і ў выхадныя) Алёна Астравух і Ларыса Каўрыга заўжды папытаюцца пра самаадчуванне, дапамогуць з накідкай, уважліва прасочаць за тым, каб пацыент не перабраў устаноўленыя нарматывы па часе: каб сам сабе не нашкодзіў.

Парадамі і падказкамі (апроч грязелячэння) дапамагае хворым медсястра Юлія Кавальчык; не раз мне даводзілася звяртацца і атрымліваць дапамогу ад дзяжурных сястрычак Іны Марушчак і Іны Смаль.

Арганічна, як выглядае, «упісалася» ў калектыў нядаўна прызначаная на пасаду галоўнай медыцынскай сястры Наталля Якушкіна. Высокі прафесійны рэйтынг маюць намеснік галоўнага ўрача Ігар Анісімаў (вельмі спакойны, спагадлівы чалавек), урач-неўролаг Юлія Аляксандраўна Камоцкая (дарэчы, не кожны санаторый мае ў штаце такога спецыяліста), а таксама прафесіяналы па ручным масажы Ірына Рэвуцкая і падводным душы-масажы Вольга Муравейнікава.

Шмат добрых слоў за час знаходжання ў санаторыі даводзілася чуць пра клапатлівых і абыходлівых медсястру фізіятэрапеўтычных працэдур Марыю Крукоўскую і культарганізатара Ірыну Цяцерыну. Пад яе непасрэдным кіраўніцтвам у санаторыі цікава праходзяць вечары знаёмстваў, інтэлектуальныя гульні, майстар-класы па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, канцэрты з удзелам саміх пацыентаў, шматлікія танцавальныя конкурсы і турніры...

Вялікую цікавасць у наведвальнікаў санаторыя, асабліва расіян, выклікаюць выязныя экскурсіі: па вячэрняй сталіцы, у Нясвіжскі і Мірскі замкі, у Брэст і Белавежскую пушчу, у Гродна, Хатынь... Пацыентам цікава наведваць нашы Мінскі трактарны і аўтамабільны заводы, кандытарскую фабрыку «Камунарка», у самім санаторыі пабачыць выступленні вядомых артыстаў беларускай эстрады...

Іншымі словамі, кіраўніцтву дзяржаўнага прадпрыемства «Санаторый «Іслач» на чале з галоўным урачом Андрэем Чэшыкам удалося стварыць моцны калектыў аднадумцаў і шчырую, дабратворную атмасферу, накіраваную на аздараўленне і адпачынак людзей, ад імя якіх і хацелася б сказаць дзякуй.

Мікалай Мікуліч,
г. Мінск.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
6 снежня 2023 г. № 44 (730)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

АКТУАЛЬНАЯ ТЭМА

МЯНЯЮ СТАТУС ДАЧНІКА...

Ці стане садаводчае таварыства населеным пунктам?

Фота БелТА.

Сёлета ў маі Прэзідэнт падпісаў Указ № 155 «Аб садаводчых таварыствах». Закон літаральна на днях уступіў у сілу. Нагадаем, што ствараўся ён з мэтай выпраўлення прабелаў і супярэчнасцяў у заканадаўстве, зыходзячы з практыкі саміх членаў садаводчых таварыстваў. Новы закон дазваляе ім пераводзіць свае «садовыя» домікі ў індывідуальныя жылыя. А само таварыства, калі яго ўдзельнікі аднагалосна прымуць такое рашэнне, змогуць або далучыцца да існуючага населенага пункта, або стварыць уласны. Карэспандэнт «МС» высвятляла, як закон прымяняецца на практыцы, у «прыгарадным» раёне.

Чаму «Усход» яшчэ не стаў пасёлкам?

У Магілёўскім раёне 172 садаводчыя таварыствы, ёсць такія, якія налічваюць больш за тысячу жыхароў. **Начальнік упраўлення эканомікі Магілёўскага райвыканкама Андрэй ШАРАЎ** сведчыць, што яшчэ ў адпаведнасці з папярэднім Указам № 50 райвыканкам штогод праводзіў тлумачальную работу з гэтымі ўтварэннямі. На пашыраную нараду запрашаліся прадстаўнікі РАУС, МНС, санітарнай службы, зямельнай, падатковай і іншых, дзе агучваліся пытанні, звязаныя з садаводчымі таварыствамі. Сёлета такую нараду правялі нават двойчы — да прынятця ўказа і пасля. Удзельнікі таварыстваў з інфармацыяй азнаёмленыя. З аднаго боку, для людзей з'явіліся новыя перспектывы, з іншага — існуе шэраг праблем, якія, на жаль, вырашаюцца не так хутка, як таго б хацелася.

З 2021 года садаводчае таварыства «Усход-2008 (Малая Бароўка)» удзельнічае ў пілотным праекце. Жыхары вырашылі стаць самастойным населеным пунктам з назвай Усход. Але, нягледзячы на тое, што ў іх ёсць усе гарадскія перавагі — і газ, і вада (бо гэта непадалёк ад Магілёва), з дваццаці пунктаў плана па пераходзе таварыства ў населены пункт за два гады атрымалася выканаць толькі два — правесці сход і ўзгадніць найменне. Працэс запаволіўся на электрычнасці. Трэба рабіць рэканструкцыю электрасетак, каб перадаць іх на абслугоўванне РЭС, а гэта не такая простая справа. Энергетыкі ўводзяць у курс, што трэба зрабіць, каб атрымаць асобны рахунак, але ёсць шмат прычын, чаму гэта нельга зрабіць хутка.

— Некаторыя слупы знаходзяцца на надзелах членаў таварыства, а павінны быць за тэрыторыяй зямельных участкаў, каб да іх быў доступ, — удакладняе Андрэй Шараў. — Калі вынесці слуп за агароджу, дарога стане больш вузкай, калі пакінуць на месцы, прыйдзецца абрэзаць кавалак зямлі, на што людзі таксама не пагаджаюцца. Да таго ж для людзей гэта адчувальныя грашовыя выдаткі. Яшчэ большыя праблемы ў садаводчых таварыстваў, якія знаходзяцца ў лясах. Ім таксама трэба будзе прафінансаваць вынас слупоў. З іншага боку, калі яны ўсё ж такі ўрэгулююць свае пытанні са слупамі і перададуць іх на баланс РЭС, будуць плаціць выключна за сябе, а не ў сярэднім, як цяпер, па таварыстве.

На другім месцы па складанасці «дарожныя» нормы — патрабаванні да шырыні праездаў, пажарныя разрывы. Без выканання іх таксама нельга арганізаваць свой населены пункт або далучыцца да ўжо існуючага. Пераход з адной формы існавання ў другую ўскладняе тое, што на тэрыторыі садаводчых таварыстваў не рэдкасць тупіковыя вуліцы, вузкія праезды. Нават тэарэтычна цяжка ўявіць, як туды можа заехаць тэхніка, ды яшчэ развярнуцца. Ёсць неадпаведнасці і па архітэктурных нормах.

— Садаводчыя таварыствы ствараліся як часовае жыллё, таму ім вельмі цяжка выканаць неабходныя патрабаванні, — канстатуе суразмоўнік. — Ёсць дыхтоўныя дамы, але хапае і такіх, якія нагадваюць вагончыкі. Апошнія будзе вельмі затратна падвесці пад жыллёвыя «стандарты». З іншага боку, большасць «садаводаў» зацікаўлена, каб іх таварыствы былі населенымі пунктамі. Яны сэканомяць на добраўпарадкаванні, падтрыманні ў рабочым стане інфраструктуры. Цяпер яны гэта робяць выключна за кошт уласных узносаў.

Але не ўсе жадаюць, каб іх «дачныя» метры сталі жылымі. Калі чалавек стаіць на паляпшэнне жыллёвых умоў, гэта значыць, ён павінен пагадзіцца з тым, што патрэба ў квадратных метрах у яго знізіцца. Бо так адбудзецца, калі дачны дом стане жылым. Па-другое, у жылым доме прыйдзецца зарэгістравацца. Інакш давядзецца плаціць за камунальныя паслугі ў поўным аб'ёме. Менавіта таму ў законе і пазначана, што рашэнне стаць самастойнымі павінна прымацца ўсімі членамі садаводчых таварыстваў аднагалосна. Каб не ўшчамляць правы і інтарэсы кагосьці з іх.

(Заканчэнне на 9-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Навацыі для інвестараў, развіццё прававой культуры і задачы для моладзі

Якія тэмы на працягу тыдня абмяркоўваліся сенатарамі

● **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ** прыняла ўдзел у пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы, на якім разглядаліся законапраекты «Аб змене Закона Рэспублікі Беларусь «Аб інвестыцыях» і «Аб змене законаў» (па пытаннях неплацежаздольнасці). «Удасканаленне заканадаўства ў сферы інвестыцый — адна з ключавых задач урада і парламента, паколькі прававыя ўмовы непасрэдна ўплываюць на інвестыцыйную прывабнасць нашай юрысдыкцыі, збалансаванасць рынку працы ў галінах, умацаванне вытворчага патэнцыялу рэгіёнаў», — адзначыла Таццяна Рунец. На пасяджэнні абмяркоўваліся нормы законапраекта, накіраваныя на стварэнне дадатковых умоў для абароны правоў інвестараў. Сенатар падкрэсліла, што кіраўнік дзяржавы паставіў задачу — распрацаваць адзіны дакумент, зразумелы інвестарам. «У сувязі з гэтым па выніках абмеркавання праекта закона на экспертным савеце пры Савеце Рэспублікі дадаткова прапануецца вызначыць дакладныя крытэрыі, якім павінен адпавядаць праект для заключэння інвестыцыйнага дагавора і ўключэння ў пералік прэферэнцыйных інвестыцыйных праектаў, а таксама ўмовы для адмовы ў заключэнні інвестыцыйнага дагавора», — адзначыла парламентарый.

● **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ** прыняў удзел у Форуме Саюза юрыстаў «Права ў сучасным свеце». Гэта першая найбуйнейшая пляцоўка для дыялогу паміж прадстаўнікамі юрыдычнай, прадпрымальніцкай, палітычнай і праваахоўнай супольнасцяў па пытаннях права ў інтарэсах грамадзян, бізнесу, удасканалення прававпрымяняльнай практыкі, прасоўвання заканадаўчых ініцыятыў у мэтах развіцця прававой культуры і рэгулявання сацыяльна-эканамічнай сферы ў сучасных умовах. Ключавая мэта форуму — стварэнне платформы для абмеркавання актуальных пытанняў, звязаных з юрыдычнай практыкай, а таксама павышэнне прафесійнага ўзроўню яго ўдзельнікаў. У мерапрыемстве прынялі ўдзел каля 700 чалавек: прадстаўнікі дзяржаўных органаў і арганізацый, судзейскага корпуса, навуковай супольнасці, бізнес-структур, грамадскіх аб'яднанняў, выкладчыкі і навучэнцы юрыдычных факультэтаў ВНУ. Сяргей Сівец выступіў спікерам на секцыі «Народаўладдзе як найвышэйшая форма ўдзелу грамадзян у кіраванні справамі дзяржавы. Прававыя традыцыі і сучаснасць».

● **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА** прыняла ўдзел у пасяджэнні Нацыянальнага савета па гендарнай палітыцы пры Савеце Міністраў. Пасяджэнне прайшло ў фармаце дыялогавай пляцоўкі са студэнцкай моладдзю «Моладзь за роўныя правы і магчымасці!» на базе Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. У ходзе пасяджэння абмяркоўваліся пытанні фарміравання ў моладзі навыкаў клопату аб уласным псіхічным і фізічным здароўі, падрыхтоўкі маладых людзей да сямейнага жыцця і адказнага бацькоўства.

Вераніка КАНЮТА.

ДАДАТКОВЫЯ РЭСУРСЫ — У ЭКАНОМІКУ РЭГІЁНА

У Віцебску прайшла 57-я пазачарговая сесія абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання. Бюджэт паўночнага рэгіёна папоўніўся больш чым на 22 мільёны рублёў, дадатковыя сродкі пойдуць на сельскую гаспадарку, сацыяльную сферу і ЖКГ.

На сесіі абласнога Савета дэпутатаў было зацверджана рашэнне аб перараз-меркаванні дадатковых рэсурсаў. Па словах **начальніка галоўнага фінансавага ўпраўлення Віцебскага аблвыканкама Генадзя ГРЭБНЕВА**, устойлівая работа эканомікі паўночнага рэгіёна дазволіла атрымаць звышпланавыя даходы на суму больш чым 16,4 мільёна рублёў. Таксама з рэспубліканскага бюджэту атрыманы мэтавыя субвенцыі ў памеры звыш 6,3 мільёна рублёў на бягучы рамонт мясцовых дарог.

З уласных даходаў на 10 мільёнаў рублёў павялічацца асігнаванні на сельскую гаспадарку, каб разлічыцца за паліва, якое набывалася для завяршэння восеньскіх палявых работ і для своечасовага пачатку падрыхтоўкі тэхнікі да вясновай пасяўной кампаніі. Адшукана магчымасць накіраваць 500 тысяч рублёў на набыццё тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі для ўразлівых катэгорый насельніцтва. Дадатковыя сродкі атрымаюць сферы адукацыі, аховы здароўя, культуры, спорту. Акрамя таго, за кошт перараз-меркавання іншых відаў расходаў райвыканкамам будзе накіравана больш за 4,8 мільёна на капітальны рамонт і мадэрнізацыю жыллёвага фонду.

Фота ТК «Віцебская вобласць. Афіцыйна».

Галоўнаму ўпраўленню жыллёва-камунальнай гаспадаркі аблвыканкама на капітальны рамонт, мадэрнізацыю і рэканструкцыю кацельняў, фінансаванне будаўніцтва палігона для ўтылізацыі цвёрдых камунальных адходаў накіруюць 434 тысячы рублёў. Працягнецца фінансаванне рэканструкцыі культурна-дзелавога цэнтра «Віцебск».

На 57-й пазачарговай сесіі абласнога Савета дэпутатаў разгледзелі пытанне фінансавання праектаў грамадзянскіх ініцыятыў, сацыяльна значных, накіраваных на развіццё мясцовых тэрыторый, на якія накіроўваў і працягвае накіроўваць сродкі ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь». Сёлета ў конкурсе праектаў грамадзянскіх ініцыятыў удзельнічалі ўсе раёны Віцебшчыны. Абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў і абласны Савет дэпутатаў выбралі шэсць пераможцаў. Сярод іх — інклюзіўны праект «Сад мары», які рэалізаваў Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Віцебскага раёна ў гарадскім пасёлку Яначы. Цяпер пажылыя людзі аддзялення дзённага знаходжання будуць навучаць школьнікаў мясцовай установы адукацыі вырошчванню і перапрацоўцы пладова-ягаднай прадукцыі. З гэтай мэтай закладзены сад, абсталявана цяпліца, закуплены электрасушылка, маразільная камера, халадзільнік і мультыварка.

«Важна, што ў праектах грамадзянскіх ініцыятыў выкарыстоўваюць не толькі бюджэтныя і пазабюджэтныя грошы — не менш за 40 працэнтаў збірае мясцовае насельніцтва, і гэта спрыяе сацыяльнаму партнёрству дзяржавы і грамадзян. У мінулым годзе па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі і Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталлі Качанавай ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» выдзеліў кожнай вобласці па 100 тысяч рублёў на рэалізацыю праектаў грамадзянскіх ініцыятыў. Віцебская вобласць таксама атрымала гэтыя грошы і паспяхова асвоіла», — адзначыў **старшыня дэпутацкага корпуса Віцебшчыны Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ**.

У Гарадоцкім раёне для арганізацыі занятасці інвалідаў закупілі абсталяванне для вытворчасці хлеба, які выпякаюць людзі з абмежаванымі магчымасцямі. На Браслаўшчыне абсталявалі гульнявую пляцоўку для сямейнага адпачынку. У Лёзненскім раёне створана развіваючая пляцоўка для дзяцей з асаблівасцямі здароўя.

Сёлета ў конкурсе ўдзельнічалі 43 праекты грамадзянскіх ініцыятыў, у 2024-м найлепшыя з іх будуць ажыццёўлены. У кастрычніку бягучага года Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу прынята рашэнне аб далейшым развіцці грамадзянскіх ініцыятыў, у паўночным рэгіёне будзе ўсталяваны прававы механізм па іх рэалізацыі.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

СТВАРЫЦЬ УНІВЕРСАЛЬНУЮ ПРАСТОРУ

Ці ўсё робіцца для таго, каб палепшыць жыццё людзей з абмежаванымі магчымасцямі

Стан інклюзіі ў рэгіёне разгледжаны на сесіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў. Акцэнт зроблены на стварэнне безбар'ернага асяроддзя ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай «Сацыяльная абарона» на 2021 — 2025 гады.

У Гродзенскай вобласці пражывае больш за 66 тысяч людзей з інваліднасцю. Дзяржавай прымаюцца значныя намаганні для забеспячэння рэалізацыі іх правоў. Гэта датычыцца ўмоў пражывання, стварэння даступных аб'ектаў вулічнай дарожнай сеткі, аб'ектаў гарадской інфраструктуры, спартыўных і культурных заняткаў.

— Стварэнне безбар'ернага асяроддзя і сацыяльнай інтэграцыі закранае інтарэсы значнай колькасці асоб фізічна аслабленых, тых, хто мае цяжкасці пры самастойным руху, атрыманні паслуг і арыентацыі ў прасторы. Да гэтай катэгорыі адносяцца не толькі інваліды, але і старыя людзі з парушэннямі здароўя, цяжарныя жанчыны, мамы з каляскамі. Безбар'ернае асяроддзе павінна стаць нормай у грамадстве, — падкрэсліла **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА**.

У адпаведнасці з падпраграмай II «Даступнае асяроддзе жыццядзейнасці інвалідаў і фізічна аслабленых асоб», у рэгіёне распрацаваны комплекс мерапрыемстваў, які накіраваны на паляпшэнне такога асяроддзя. Па словах начальніка аддзела сацыяльнай абароны і сацыяльнага абслугоўвання абласнога камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Алены Ліхач, сёлета запланавана больш за 120 адпаведных мерапрыемстваў. За дзевяць месяцаў рэалізавана больш за 65 працэнтаў плана. Поўнасцю завершана работа на 76 планавых аб'ектах. Часткова абсталяваныя аб'екты сацыяльнай інфраструктуры і жылога фонду.

На правядзенне работ па стварэнні даступнага асяроддзя на аб'ектах сацыяльнай інфраструктуры ў 2023 годзе ў рамках падпраграмы прадугледжана амаль 325 тысяч рублёў мясцовага бюджэту. Але фактычна выдзелена па стане на пачатак лістапада значна больш — амаль 543 тысячы. Па выніках трох кварталаў 2023 года асвоена 340 тысяч рублёў, што складае 105 працэнтаў ад плана па Дзяржаўнай праграме. Самы значны дадатковы транш — звыш 130 тысяч рублёў — атрыманы на абсталяванне жылога фонду, яшчэ 90 тысяч звыш плана паступіла для стварэння безбар'ернай дарожна-паркавай інфраструктуры. Пераважная большасць сродкаў ужо асвоена, на некаторых аб'ектах работы працягваюцца.

Трэба сказаць, што да супрацоўніцтва па абсталяванні планавых аб'ектаў прыцягваюцца прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў. Такім чынам, праведзена каля 180 манітарынгаў, у ходзе якіх былі выяўлены тыповыя для многіх раёнаў праблемы. Напрыклад, не ўсюды ўлічваецца комплексны падыход, які павінен спалучаць абсталяванне як для інвалідаў з парушэннямі апорна-рухальнага апарата, так і для тых, хто мае парушэнні зроку.

Ёсць заўвагі па несвоечасовым выдзяленні сродкаў. Як правіла, яны паступаюць з II квартала, што негатыўна ўплывае на тэрміны работ. Такім чынам, у шэрагу раёнаў аб'ём запланаваных работ выкананы толькі напалову.

— Шэраг раёнаў выконваюць свае абавязкі недастаткова хутка, у выніку чаго нашы маламабільныя альбо фізічна аслабленыя грамадзяне не маюць магчымасці атрымаць самыя неабходныя паслугі. Я маю на ўвазе

адсутнасць пандусаў, а не нейкіх там спецыяльных прыстасаванняў, — заўважыла падчас сесіі Алена Пасюта.

На думку старшыні аблсавета, цяпер важна шырока інфармаваць грамадства аб праблемах інвалідаў і магчымасцях іх вырашаць, развіваць пазітыўныя адносіны да людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Фізічная асаблівасць, на яе думку, не павінна стаць перашкодай для паездак ці наведвання масавых мерапрыемстваў. Патрэбы ўсіх грамадзян варта ўлічваць ужо на стадыі праектавання новых аб'ектаў і пры капітальных рамонтах, тым самым ствараючы ўніверсальную жыццёвую прастору.

Дэпутаты абласнога Савета прызналі работу па стварэнні даступнага асяроддзя здавальняючай і прынялі рашэнне стымуляваць выканаўцаў планавых мерапрыемстваў у наступным годзе.

Так, на 2024 год запланавана правядзенне работ на 110 аб'ектах сацыяльнай і дарожна-транспартнай інфраструктуры. Пры гэтым будзе звернута ўвага на важнасць такіх параметраў, як своечасовыя тэрміны і якасць работ.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота з адкрытых крыніц.

МЯНЯЮ СТАТУС ДАЧНІКА...

Ці чакаюць новых жыхароў у сельсаветах?

Старшыня Кадзінскага сельсавета Ганна НОВІКАВА кажа, што садаводчыя таварыствы — а іх на тэрыторыі сельсавета 18 — пакуль існуюць аўтаномна. І зрухаў у бок змянення іх статусу ад «садаводаў» не назіраецца.

— Сёння мы не звязаныя з імі наогул, — удакладняе Ганна Новікава. — Гэта самастойныя юрыдычныя асобы. У іх свой старшыня, свой статут. Яны знаходзяцца на тэрыторыі нашага сельсавета, але нам не падпарадкоўваюцца. Яны тэарэтычна могуць стаць населеным пунктам, але ім трэба будзе цалкам перабудавацца. Гэта датычыцца і пераходу на абслугоўванне РЭС, і нарматываў па дарогах. У нас наогул няма такіх садаводчых таварыстваў, якія б адпавядалі статусу населеных пунктаў па дарогах. Калі «садаводы» ўсё ж такі выканаюць неабходныя патрабаванні, іх хутчэй за ўсё далучаць да існуючых населеных пунктаў. Напрыклад, ёсць у нас вёска Падбелле, непадалёк ад якой знаходзіцца некалькі садаводчых таварыстваў. Для сельсавета гэта будзе, вядома, дадатковая нагрузка. У кожным садаводчым таварыстве ад 30 да 300 чалавек, і ўсіх іх прыйдзецца зарэгістраваць па новым месцы жыхарства. Павялічыцца нагрузка на спецыяліста, стане болей адміністратыўных працэдур. Гэта і выдача даведак аб складзе сям'і, і перадача даных аб зямельных участках у падатковую інспекцыю, каб налічваўся падатак на маёмасць. Перавод дамоў у жылыя пацягне за сабой змены ў прызначэнні зямельных участкаў. Трэба будзе вырашаць пытанні па пакосе травы летам, расчыстцы дарог зімой. Аб'ём работы вялікі.

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

«Мы за населены пункт...»

Старшыня праўлення самага буйнога садаводчага таварыства «Хімік (Сідаравічы)», што за 20 кіламетраў ад Магілёва, **Сцяпан ГАЛОДНІКАЎ** марыць, як і большасць тутэйшых жыхароў, каб яны сталі часткай бліжэйшага да іх аграгарадка Сідаравічы. У «Хіміку» з улікам яшчэ аднаго таварыства, якое суіснуе з ім, — «Трыкатажнік-2009» — жыве 1300 чалавек. Указ № 155 дае магчымасць таварыству далучыцца да населенага пункта, але ёсць некалькі праблемных момантаў, якія робяць мару нерэальнай.

Па-першае, гэта ўсё тыя ж унутраныя электрасеткі, якія трэба перадаць на абслугоўванне РЭС.

— Наша таварыства ўтварылася ад «Магілёўхімвалакно» 40 гадоў таму, — расказвае Сцяпан Галоднікаў. — Адпаведна і лініі электрапередачы старыя. А гэта значыць, што правады рвуцца, адбываюцца вялікія страты электраэнергіі. Выдаткі на іх складаюць да 40 % нашых узносаў. На тэрыторыі 800 светлавых апор, і каб перадаць іх на абслугоўванне энергетыкам, трэба заплаціць не меней за 800 тысяч — па тысячы-паўтары за кожную апору. Але не кожнаму з нашых жыхароў гэтая сума па кішэні. Членскія ўзносы і без гэтага складаюць каля 77 рублёў у месяц. Мы замянялі правады на пяці вуліцах, але іх у нас болей за 40.

Суразмоўнік кажа, што, калі б была магчымасць перадаць унутраныя электрычныя сеткі на баланс энергетыкаў так жа, як і высакавольтныя, — бясплатна, праблема б вырашалася хутка.

Яшчэ адзін камень спатыкнення ў пакмненнях таварыства далучыцца да аграгарадка — неабходнасць згоды на гэта ўсіх без выключэння жыхароў. Так прапісана ў законе. Калі б была магчымасць прыняць рашэнне большасцю галасоў, праблем не было б. На думку суразмоўніка, вельмі было б добра, калі б такая папраўка з'явілася ў прававых актах.

Сцяпан Галоднікаў лічыць, што статус населенага пункта дазволіў бы бязбольна вырашаць шэраг праблем, якія існуюць у таварыстве на сённяшні дзень. Адзін з іх датычыцца меліярацыі.

— У нас балоцістая мясцовасць, — кажа суразмоўнік. — Пачынаючы з восені, зямельныя ўчасткі, а дзесьці і дамы тонуць у вадзе. Мы звярталіся ў райвыканкам, каб правялі меліярацыю, але нам тлумачаць, што мы не ўваходзім у дзяржпраграму. Калі б мы мелі статус населенага пункта, была б іншая размова.

Акрамя гэтага ёсць і іншыя пытанні. «Мы дабіліся, каб да нас па суботах і нядзелях прыязджаў рэйсавы аўтобус, і гэта вялікі плюс, — кажа Сцяпан Галоднікаў. — Нас папярэдзілі, што калі пасажырапаток будзе невялікі, то маршрут у студзені закрыюць. Але мы, наадварот, хацелі б, каб ён заязджаў да нас яшчэ і ў сераду. Яго паслугамі карыстаецца каля 40 чалавек. Калі б мы былі населеным пунктам, не прыйшлося б даказваць, што аўтобус нам проста неабходны.

На тэрыторыі таварыства пастаянна пражывае каля 50 чалавек. Шмат хто праводзіць тут свой водпуск, рэгулярна наведваецца. Апошнім часам тут стала болей моладзі і яны аддаюць перавагу менавіта вясковаму ладу жыцця. Тут прыгожа, вакол растуць сосны.

— Мае бацькі пабудавалі дом яшчэ 40 гадоў таму. Я, лічы, тут вырас, — прызнаецца старшыня праўлення. — Я вельмі перажываю за будучае нашага «Хіміка», і не толькі я адзін. Мы і працуем з аднадумцамі тут больш за ідэю. Такіх дружных жыхароў яшчэ трэба пашукаць. Але, каб закон працаваў, павінны быць дапаўненні да яго. Гэта, як я ўжо казаў, датычыцца ўмоў перадачы ўнутраных электрасетак РЭС і згоды жыхароў на змяненне статуса. Няхай будзе хоць бы 55 % насельніцтва, бо 100 % згодных — гэта нерэальна.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

«ПАКУЛЬ УСЕ НЮАНСЫ ЦЯЖКА ПРАДБАЧЫЦЬ»

Сваё меркаванне выказалі прадстаўнікі садовых таварыстваў самага «дачнага» — Гродзенскага раёна

Як правіла, нарматыўныя дакументы прымаюцца з мэтай удасканалвання дзейнасці ў той ці іншай сферы. Па словах дачнікаў, тыя моманты, якія былі актуальнымі 15 гадоў таму, патрабавалі дапрацоўкі. У таварыствах новы ўказ абмяркоўваецца, ідзе ўзаемадзеянне з мясцовымі органамі ўлады. Відавочна, што новы нарматыўны дакумент дапаможа зняць вострыя пытанні, якія ўзнікаюць на месцах.

Напрыклад, у садовым таварыстве «Лілея» стаіць праблема пустых дамоў. Па словах старшыні Тамары Рабышко, з 256 участкаў апрацоўваецца хіба што палова. І гэта пры тым, што кааператыў знаходзіцца ўсяго ў дзесяці кіламетрах ад абласнога цэнтра. Па сённяшніх мерках, лічы, каля гарадской рысы.

Тэрыторыя таварыства пачала асвойвацца ў сярэдзіне 90-х гадоў і насіла сезонны характар. Мабыць, таму дачнікі не клапаціліся аб інфраструктуры — да гэтага часу тут няма ні водаправода, ні электрычнасці. Сёння вырашаць гэтыя пытанні становіцца даволі складана, кажа старшыня. Хто мае сродкі, можа дазволіць сабе свідравіну, некаторыя правялі святло за асобную плату. Але большасць участкаў стаяць закінутымі. Магчыма, такая сітуацыя склалася з-за вялікай колькасці зямельных участкаў, якія прадастаўляюцца ў мясцовым сельскім Савеце для будаўніцтва жылля. А там ёсць усе патрэбныя камунікацыі. Таму многія замест набыцця дачы выбіраюць менавіта такі шлях.

Ці будзе надалей развівацца данае таварыства, невядома. Новых заявак амаль няма, а тыя, хто часам бярэ ўчастак, праз год-два закідваюць гэтую справу. Тамара Рабышко спадзяецца, што новы ўказ дапаможа ўпарадкаваць сітуацыю з уласнікамі, якія не даглядаюць свае дачныя сядзібы.

Згодна з новым дакументам, будзе праводзіцца інвентарызацыя ўчасткаў, у ходзе якой будуць вырашацца пытанні, звязаныя з паступленнем у камунальную ўласнасць безгаспадарчых пабудоў. Указ № 155 дасць магчымасць мясцовым уладам выстаўляць закінутыя домікі на аўкцыён і прадаваць. Магчыма, такі падыход падштурхне ўласнікаў да дзейнасці альбо дасць магчымасць новаму гаспадару пабудаваць свой дом. А мясціны тут прыгожыя, кажа субяседніца.

У іншага субяседніка — старшыні садовага таварыства «Пагародна» Алега Чартка — праблем з пустымі дамамі няма. Калі хтосьці выстаўляе свой участак на продаж, у хуткім часе знаходзіцца новы гаспадар. Прычым сярод новых уладальнікаў у асноўным моладзь. Многія пачалі актыўна ўкладваць сродкі ў загарадныя дамы.

— У нас усё забудавана, усе 264 участкі, свабодных няма. Людзі будуюць даволі грунтоўныя дамы, многія там і жывуць. У таварыстве ёсць вада, праведзена святло. Разам са спецыялістамі зямельнай службы райвыканкама робім перыядычна агляды. Звычайна гэта адбываецца напярэдадні дачнага сезона, дзесьці ў маі прыязджаем. Калі бачым, што ўчастак зарослы, выпісваем прадпісанне, з тым, каб людзі гэта выправілі, прывялі ў парадак. Але такія выпадкі хутчэй выключэнне, чым правіла, — кажа Алег Чарток.

> У Гродзенскай вобласці налічваецца 770 садаводчых таварыстваў, з іх палова — у Гродзенскім раёне. Гэта самы масавы «дачны» раён, дзе знаходзіцца 390 таварыстваў. Яшчэ каля 120 — у Лідскім. У астатніх сямі раёнах вобласці дачнае жыццё амаль не бачна — тут гэта лічба ледзьве даходзіць да пяці. Колькасць зямельных участкаў таксама розная. У адным таварыстве яна можа налічваць 30, а ў іншым можа быць і больш за 300.

Між тым новы ўказ, па яго словах, дазволіць больш справядліва падысці да фарміравання ўзносаў. Пакуль тут існуе аднолькавы памер — і ў тых, хто мае пяць сотак, і ў тых, хто мае дзесяць. Зараз плата будзе залежаць ад плошчы і фарміравацца ў адпаведнасці з выведзеным каэфіцыентам. Хто мае большы участак, той плаціць і большы ўзнос.

Субяседнік звяртае ўвагу на яшчэ адзін важны момант — вырашэнне пытання энергетычнай інфраструктуры. Указам зацверджаны парадак перадачы ва ўласнасць дзяржавы ліній электрапередачы і трансфарматарных падстанцый садаводчых таварыстваў. Гэта дазволіць забяспечыць іх надзейную эксплуатацыю, а члены таварыства змогуць прымяніць тарыф на спажываемую энергію як для жылога фонду. Сёння ў дачнікаў кошт кілаватаў значна вышэйшы.

— Для нас гэта будзе выгадна, але трэба выканаць пэўныя ўмовы, перш чым нашу энергасістэму прымуць на баланс электрасетак. Гаворка ідзе аб вынасных лічыльніках уліку электраэнергіі і належным стане электраліній. Таму цяпер мы якраз і пачалі займацца мадэрнізацыяй гэтай сістэмы. Мы замянялі трансфарматар і ўжо здалі яго на баланс энергетыкам. А вось унутраныя лініі патрабуюць значнага аднаўлення. Іх вялі 15 гадоў таму, калі патрэбы ў электраэнергіі былі значна ніжэйшыя. Зараз яе спажыванне ўзрасло. Каб павялічыць магутнасць, трэба пракладваць новы кабель і гэтак далей, — паведаміў старшыня таварыства.

Па яго словах, гэта пытанне ў стадыі падрыхтоўкі. Вядзецца пошук падраднай і праектнай арганізацыі. Фінансавыя пытанні будуць вырашацца на агульным сходзе, які плануецца правесці з надыходам вясны.

Новы ўказ прадугледжвае таксама рэгуляванне пытанняў у вобласці кіравання садаводчым таварыствам. Так, у мясцовых органаў улады цяпер ёсць права прызначаць старшыню праўлення таварыства, а таксама патрабаваць правядзення пазачарговага агульнага сходу. Такі падыход, лічыць Алег Чарток, правамерны, як і атрыманне ў мясцовых выканкамах інфармацыі аб выманні альбо прадастаўленні зямельных участкаў. Усе гэтыя працэдуры дапамогуць рэгуляваць і ўпарадкаваць дзейнасць садаводчых таварыстваў. Ёсць і іншыя навацыі, якія пачынаюць праходзіць апрабацыю на практыцы. Пакуль усе нюансы цяжка прадбачыць. Галоўнае, што ўказ улічвае тыя моманты, з якімі даводзіцца сутыкацца дачнікам у штодзённым жыцці.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота з адкрытых крыніц.

ХОЦЬ НА ДЗЯНЁК У НАШ БАРОК!

Сіла захавання традыцый і народнай памяці ў рэальных справах

Іх вёска жыве, не гасне, нягледзячы на блізкасць вялікага горада. Так могуць расказаць пра свой пасёлак жыхары Барка, што ва Урыцкім сельсавеце Гомельскага раёна. Пражывае тут больш за дзвесце чалавек. Гэты год для мясцовых выдаўся асабліва багатым на падзеі. У пасёлак «прыйшоў» газ, падрыхтавалі праектна-каштарысную дакументацыю для будучых водных сетак. Але акрамя вырашэння надзённых жыццёвых пытанняў жыхары Барка з нецярпеннем чакалі ўвасаблення ў жыццё важнай патрыятычнай справы. Напярэдадні святкавання 80-годдзя вызвалення Гомеля і Гомельскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў сіламі ўраджэнцаў і жыхароў пасёлка, мясцовых улад і спонсараў быў адкрыты памятны знак аднавяскоўцам — братам Крычаўцовым.

> Людзі вельмі задаволены, прымаюць актыўны ўдзел і ў падрыхтоўцы да свят. Дапамагаюць з іх арганізацыяй, бо мы афармляем святочную пляцоўку. На Дзень пажылых людзей, напрыклад, разам вельмі кранальна ўшаноўвалі нашых старажылаў, на 100-годдзе Барка святочна віншавалі ўсіх, хто нарадзіўся і дагэтуль жыве ў пасёлку.

Ганарацца землякамі

Цяпер мемарыял у гонар брацкага экіпажа Канстанціна, Міная і Елісея Крычаўцовых сустракае і праводзіць... Памятны знак устаноўлены на ўездзе ў населены пункт. Сёння кожны жыхар Барка шануе памяць аб сваіх земляках і ведае іх кароткую, але гераічную гісторыю жыцця. Браты выраслі ў сям'і былога вясковага настаўніка, рэгента царкоўнага хору. Бацька вялікага сямейства ўступіў у калгас, працаваў садоўнікам. Сыны добра вучыліся ў школе, былі музычна адоранымі. У 1939 годзе да прызыву ў Чырвоную Армію двое старэйшых братоў скончылі Гомельскае музычнае вучылішча. Мінай паступіў у Беларускую дзяржаўную кансерваторыю. Так супала, што ў адзін час у двух старэйшых братоў скончылася адтэрміноўка ад прызыву на ваенную службу, а малодшы брат Елісей яшчэ вучыўся ў Гомельскім музвучылішчы. Ён адмовіўся ад адтэрміноўкі, каб пайсці служыць разам са сваімі братамі. Іх бацька звярнуўся да міністра абароны Савецкага Саюза з просьбай, каб яго тры сыны праходзілі тэрміновую службу ў адным танкавым экіпажы. Так і здарылася. У родны Барок у бацькоўскую хату браты ў апошні раз прыехалі перад вайной. У 1941-м іх часць перавялі ў Заходнюю Беларусь. Экіпаж братоў Крычаўцовых адзначыўся ў баях з фашыстамі з першых дзён вайны. 26 чэрвеня 1941 года паблізу чыгуначнай станцыі каля Беластока падчас бою браты Крычаўцовы падбілі галаўны танк ворага. Але нямецкі снарад патрапіў і ў танк братоў, іх машына загарэлася. Брацкі экіпаж прыняў рашэнне ісці на таран, каб цаной свайго жыцця нанесці ворагу як мага больш страт. Гэта быў апошні бой братоў-герояў і першы ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны танкавы таран.

У іх родным пасёлку Барку іменем землякоў названа вуліца, а цяпер яшчэ і адкрыты памятны знак. Тым, як удалося ўвасобіць у жыццё ідэю ўвекавечання памяці землякоў, вельмі задаволеныя ўсе жыхары пасёлка, адзначае **памочнік старшыні Урыцкага сельскага Савета дэпутатаў Гомельскага раёна па пасёлку Барок Ніна КУРЫЛЕНКА**.

— Усе нашы жыхары клапоцяцца аб пасёлку. У нас склалася такая практыка, што ўсе пытанні, прапановы, якія датычацца жыццезабеспячэння, увогуле прыняцця любога рашэння па пасёлку, абмяркоўваем і прымаем рашэнні калектыўна. Многія прапановы па паляпшэнні жыцця ўзнімаюцца на агульных сходах. Тое, што можам выканаць самастойна, робім, а там, дзе неабходна падтрымка, парада, звяртаемся да часова выконваючага абавязкі старшыні Урыцкага сельвыканкама Міхаіла Выгляда, — расказвае Ніна Курыленка.

Ніна Міхайлаўна — памочнік старшыні Урыцкага сельскага Савета дэпутатаў па пасёлку Барок амаль дзесяць гадоў. Доўгі час яна працавала ў сферы дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі — узначальвала аддзяленне дзённага знаходжання для маладых людзей-інвалідаў. Цяпер яна на пенсіі, але працягвае актыўную работу з людзьмі. Памочнік старшыні сельсавета па пасёлку — аўтарытэт, праверaны гадамі жыцця ў вёсцы. Звяртаюцца да яе людзі з любой праблемай.

— Мая задача — аператыўна перадаць хвалюючыя пытанні, якія ўзнікаюць, кіраўніцтву сельсавета, дапамагчы ў іх вырашэнні. У нашым пасёлку мы актыўна ўкараняем такую форму работы з людзьмі, як анкетаванне, апытанне па любым хвалюючым пытанні. У пасёлку дзейнічае ініцыятыўная група, у якую ўваходзяць як жыхары старэйшага пакалення, так і наша моладзь. Гэта Таццяна Мячыкава, Аксана Сідарэнка, Алена Гуц, Галіна Нікіціна. Разам праводзім тлумачальную работу з вяскоўцамі, арганізоўваем мерапрыемствы, — падзялілася Ніна Курыленка.

Іх ініцыятыўная група пераканана, што можна зрушыць з месца любую карысную справу. Арганізуюць актывісты Барка людзей праз сустрэчы на вуліцы, звароты ў сеціве і па тэлефоне. Жыхары пасёлка вельмі спагадлівыя. Напрыклад, тое што ў пасёлку няма свайго клуба, не перашкаджае мясцовым актыўна праводзіць святы вёскі. Дапамагаюць праводзіць мерапрыемствы і артысты з Урыцкага цэнтра культуры і вольнага часу. У гэтым годзе значнай падзеяй у жыцці пасёлка Барок, напрыклад, стала святкаванне 100-годдзя заснавання населенага пункта. Падрыхтаваліся вяскоўцы і правялі пазнавальнае мерапрыемства, безумоўна, і з нагоды адкрыцця памятнага знака ў гонар герояў Вялікай Айчыннай вайны, аднавяскоўцаў братоў Крычаўцовых.

— Людзі вельмі задаволены, прымаюць актыўны ўдзел і ў падрыхтоўцы да свят. Дапамагаюць з іх арганізацыяй, бо мы афармляем святочную пляцоўку. На Дзень пажылых людзей, напрыклад, разам вельмі кранальна ўшаноўвалі нашых старажылаў, на 100-годдзе Барка святочна віншавалі ўсіх, хто нарадзіўся і дагэтуль жыве ў пасёлку, — звяртае ўвагу Ніна Курленка. — З павелічэннем колькасці дзяцей, якія стала пражываюць у пасёлку ці прыязджаюць на канікулах да сваякоў, мы вырашылі, што вельмі важна прадумаць арганізацыю іх вольнага часу. Заахвочваем дзяцей і моладзь да вывучэння былых вясковых традыцый. У нас ужо ёсць вопыт арганізацыі і правядзення народных калядных гулянняў. Цяпер рыхтуемся працягваць гэтую традыцыю і далей.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота з архіва герояў.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 3820000007667 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 10.280. **Нумар падпісаны ў 19.30 5 снежня 2023 года.**

Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

ГЛЫБОКАЕ

У калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава, складзенай са старых паштовак і іншага фатаграфічнага матэрыялу, выяў з глыбоцкімі краявідамі дастаткова. Толькі ў філакартычным альбоме «Ад Віцебска да Полацка. Падарожжа ў часе», які сёлета выйшаў у Выдавецкім доме «Звязда», мы налічылі ажно 28 рэпрадукцый.

Віртуальна праз іх мы і сутыкнёмся з Глыбокім і яго ваколіцамі пачатку XX стагоддзя. Пройдземся па Замкавай вуліцы, пабываем на Кірмашовай плошчы. Адна з паштовак дэталізуе гандлёвы рад на Кірмашовай плошчы, паказвае яе з іншага ракурсу. Іншая паштоўка прысвечана возеру перад Глыбокім, на ёй адбітак горада падае на ваду. Уражанне такое, што выява выпісана пэндзлем мастака... На іншай — Петрапаўлаўская царква і Беразвецкі кляштар базыльян удалечыні. А вось — касцёл у Задарожжы. Побач — касцёл Унебаўзняцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Дзеркаўшчыне. А яшчэ — касцёл у Залессі... Можам зазірнуць і ў заснежаную Лаўрынаўку 1916 года, наведаць Свята-Троіцкую царкву ў Мамаях, Свята-Пакроўскую царкву ў Ваўкавыску, Свята-Мікольскую царкву ў Друі, Свята-Мікольскую царкву ў Друі, Свята-Мікольскую царкву ў Друі...

Глыбокае. Замкавая вуліца. Пачатак XX стагоддзя.

Глыбокае. Беразвецкі манастыр. 1930-я гады.

дацца на службу ў праваслаўную царкву ў вёсцы Кавалі (у далёкім 1936 годзе). А як цікава разглядаць царкву і палац у Мамаях! Альбо — паштоўкі старога, даўняга мястэчка Мосар... Касцёл Святой Ганны ў Мосары ёсць адразу на некалькіх рэпрадукцыях. Следам — наша знаёмства з Удзеламі, Парэччам, Чарневечамі...

Цікавым на адной са старых паштовак падаецца і хрэсны ход у Празароках. Гэта ў Празароках пахаваны пачынальнік беларускага тэатра Ігнат Буйніцкі (1861 — 1917). Магіла яго знаходзіцца ў скверы паселішча. Цытуем з краязнаўчага даведніка «Літаратурныя мясціны Беларусі», які выйшаў у «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі» ў 2000 годзе: «...Праз 30 гадоў пасля смерці І. Буйніцкага жыхар Празарокаў І. Чомер засведчыў, што «памяць пра Буйніцкага сярод жыхароў вёскі Празарокі жыве дагэтуль. Успамінаюць яго самымі цёплымі словамі, а некаторыя маюць яго фатаграфіі, якімі даражаць як святыняю». Помнік Буйніцкаму ў Празароках устаноўлены ў 1976 годзе, аўтарам яго з'яўляецца народны мастак Беларусі Іван Міско. Дарэчы, закінутую магілу акцёра і рэжысёра адшукалі ў 1970-я гады Уладзімір Караткевіч і тэатразнаўца Уладзімір Няфёд. Тады ж парэшткі Ігната Цярэнцьевіча былі перанесены ў Празарокі і перапахаваны ў парку. Гэта Буйніцкі вывеў на сцэну беларускі «мужыцкі» танец. Як пастаноўшчык і выканаўца Ігнат Цярэнцьевіч паказаў усю прыгажосць беларускіх народных танцаў. У 1907 годзе ў сядзібе Паліваў паблізу Празарокаў славуты ўраджэнец Глыбоччыны заснаваў самадзейны тэатр. Спярша ўдзел у ім прымалі сваякі, блізкія знаёмыя Буйніцкага. У тэатры ўдзельнічала восем акцёраў, а яшчэ прыблізна 16 танцораў. Буйніцкі арганізоўваў прадстаўленні ў Празароках і іншых паселішчах Глыбоччыны. Увайшла ў гісторыю беларускай культуры і «Першая беларуская вечарынка ў Вільні», якую акцёр і рэжысёр паставіў 12 лютага 1910 года па запрашэнні рэдакцыі «Нашай нівы». Другое яркае выступленне трупы з Празарокаў адбылося 22 лютага 1910 года на вечары, прысвечаным культурам народаў Паўночна-Заходняга краю. Кампазітар Людамір Міхал Рагоўскі напісаў да гэтай падзеі музыку на словы верша Янкі Купалы «А хто там ідзе?». Твор стаў неафіцыйным гімнам трупы. У наступныя гады (1910 — 1913) тэатр гастраляваў у Нясвіжы, Пастаўлах, Полацку, Слуцку, іншых гарадах, а таксама двойчы выступаў у Пецярбургу. У 1982 годзе ў школе ў вёсцы Празарокі быў заснаваны музей Ігната Буйніцкага.

На Глыбоччыне, ды і ў самім Глыбокім можна адкрыць адрасы многіх славутых людзей. У горадзе нарадзіўся вядомы савецкі гісторык і філолаг Барыс Волін (1886 — 1957). У дарэвалюцыйныя гады, да 1917-га, ён рэдагаваў падпольную бальшавіцкую газету «Уфимский рабочий». Вымушаны быў эмігрыраваць у Францыю. Некаторы час у дні ўзброенага паўстання 1917 года быў старшынёю Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта Замаскварэчча. Напрыканцы 1920-х гадоў стаў адказным рэдактарам часопіса «Трезвость и культура». У другой палове 1930-х гадоў пад рэдакцыяй Д. Ушакова і Б. Воліна быў выдадзены чатырохтомны «Тлумачальны слоўнік рускай мовы». У 1936 — 1945 гады наш зямляк — галоўны рэдактар «Исторического журнала». Глыбокае — радзіма славутага рускага паэта Мікалая Мінскага (1855 — 1937), які разам з Васілём Разанавым, Зінаідай Гіпіус, Дзмітрыем Мережкоўскім у 1901 годзе заснаваў у Пецярбургу Рэлігійна-філасофскія сходы. У 1905 годзе паэт спачуваў сацыял-дэмакратам, разам з Максімам Горкім узначальваў бальшавіцкую газету «Новая Жизнь».

Глыбокае — радзіма Героя Савецкага Саюза Канстанціна Максімавіча Пятроўскага (1892 — 1965). У Вялікую Айчынную вайну наш зямляк служыў першым памочнікам капітана па палітычнай частцы лесавоза «Стары бальшавік». Цеплаход перавозіў грузы ў склад саюзнага канвоя з Рэк'явіка (Ісландыя) у Мурманск: ваенную тэхніку, паліва, прадукты харчавання. 28 мая 1942 года караван быў атакаваны варожымі самалётамі і падводнымі лодкамі. Адна з бомб трапіла ў «Стары бальшавік». Англічане, якія суправаджалі караван у якасці эскорту, прапанавалі экіпажу пакінуць лесавоз. Але ніводзін марак не сышоў з судна. Караван адышоў, пакінуўшы палаючы карабель. Экіпаж разам з К. Пятроўскім змагаўся з полымем, карабель выстаяў і даставіў у Мурманск вельмі патрэбныя фронту грузы. Пятроўскаму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У Цемруку (Краснадарскі край, Расійская Федэрацыя), дзе жыў пасля вайны наш зямляк, на гарадскім мемарыяле Канстанціну Максімавічу ўсталяваны надмагільны помнік. Мо да 80-годдзя Вялікай Перамогі ў Глыбокім ці Віцебску з'явіцца вуліца імя Канстанціна Пятроўскага?

Глыбокае. Кірмашовая плошча. Пачатак XX стагоддзя.

Задарожжа. Касцёл. Пачатак XX стагоддзя.

Нарадзіўся ў Глыбокім і правёў тут свае дзіцячыя гады вядомы рускі савецкі пісьменнік Лявонцій Іосіфавіч Ракоўскі. Удзельнічаў у Грамадзянскай вайне. Большую частку свайго жыцця пражыў у Петраградзе — Ленінградзе. У 1927 годзе выдаў першы зборнік апавяданняў — «Зялёная Амерыка». Л. Ракоўскі — аўтар кніг «Генералісімус Суворaў», «Адмірал Ушакоў», «Кутузаў», «Міхаіл Тухачэўскі», «Канстанцін Заслонаў»...

І, канешне ж, памятаюць у Глыбокім савецкага авіяканструктара, аднаго з заснавальнікаў савецкай рэактыўнай і звышгукавой авіяцыі Паўла Восіпавіча Сухога (1895 — 1975). Двойчы Герой Сацыялістычнай Працы, ён лічыцца стваральнікам дзясяткаў знішчальнікаў, бамбардзіроўшчыкаў, штурмавікоў. У Маскве, Гомелі, Віцебску і Глыбокім імя канструктара носяць вуліцы. У СШ № 1 горада Глыбокага створаны музей у гонар знакамітага земляка.

Ідучы рознымі сцежкамі-дарожкамі ў Глыбокім, у паселішчах Глыбоччыны, ідучы слядамі блізкіх і далёкіх прашчураў, вы адкрыеце шмат цікавага, звернеце ўвагу на многія адметнасці гэтага краю, прыхіняцеся да яго ўнікальнай прыроды.

Кастусь ЛЕШНІЦА.
Паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.

Глыбокае. Выгляд ад возера. Пачатак XX стагоддзя.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 19 декабря 2023 года повторного открытого аукциона с понижением на 20 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Условие продажи: после проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельного участка (лоты №№ 1, 2, 3, 4)**, необходимого для обслуживания предмета аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Покупателя		
1	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14328**, общей площадью **692,4** кв. м, назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на восемь транспортных единиц** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание гаража на восемь транспортных единиц). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/10, гараж. **Капитальное строение с инв. № 320/С-38833** общей площадью **4 241,6 кв. м**, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **участок автодорог для обслуживания транспортного цеха** (составные части и принадлежности: А-автодороги, въезды с асфальтобетонным покрытием). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2, территория ОАО «Белфа» г. Жлобина. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321850100003004080** общей площадью **0,6257 га** – для обслуживания гаража на восемь транспортных единиц, гаража на пять транспортных единиц с диспетчерской (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9	**191 040,00**	19 104,00
2	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-34609**, площадью **894,4 кв. м**, назначение – складское помещение, наименование – **изолированное помещение № 5**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д. Красный, 2/1-5. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340800000003000135** общей площадью **16,3759 га – для обслуживания зданий и сооружений меховой фабрики (право аренды доля ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин 961/1000). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1	**84 288,00**	8 428,80
3	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-34612**, площадью **3 453,9 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 8**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-8. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340800000003000135** общей площадью **16,3759 га – для обслуживания зданий и сооружений меховой фабрики (право аренды доля ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин 961/1000). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1	**332 025,16**	33 202 52
4	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-34622**, площадью **9 151,1 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 14**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-14. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340800000003000135** общей площадью **16,3759 га – для обслуживания зданий и сооружений меховой фабрики (право аренды доля ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин 961/1000). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1	**814 699,04**	81 469 90

Продавец: ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин. 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 797-88-07, заместитель директора по техническим вопросам Галактионов Виктор Владимирович.

Шаг аукционных торгов – 5 %.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** Р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №__ (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 06 декабря 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 15 декабря 2023 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

Для участия в аукционе предоставляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 17.10.2023 г. № 201 (30081).

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Предмет аукциона – Лот:
капитальное строение с инвентарным номером 111/С-6550 (наименование: ремонтная мастерская; назначение: здание специализированное для ремонта и (или) технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные, зарядные и газонаполнительные станции)), площадью 1044,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Жеребковичский с/с, 6, 0,1 км юго-западнее д. Зубелевичи, на земельном участке с кадастровым номером 125081100001000054 площадью 0,1773 га, составные части и принадлежности: крыльца

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	260 876,08	Размер задатка, руб.	26 087,61

Продавец: ОАО «Нача», Брестская обл., Ляховичский р-н, аг. Нача, ул. Советская, 16, тел./факс 80163352505. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ №116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. Условия продажи: без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

Аукцион состоится 22 декабря 2023 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 21 декабря 2023 г. до 17.00

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by**
Продавец	**ООО «Вторсистемтехнология», г. Брест, ул. 2-я Заводская, 2/16, пом. 3**

Предмет электронных торгов: ПРОХОДНАЯ (здание специализированное иного назначения),
инв. номер 110/С-87282, общ. пл. 17,6 кв. м,
по адресу: Брестская обл., г. Барановичи,
пер. Водопроводный, 2-й, 25.
Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка.
Начальная цена с НДС 20 % – 21 600,00 белорусских рублей (снижение 28 %).
Сведения о земельном участке с кадастровым номером 141000000007002898:
предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания производственной базы общей площадью 0,0730 га

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB 30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.11.2023

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 28.12.2023 г. с 11.00 до 13.00
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **27.12.2023 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел. +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

ИНФОРМАЦИЯ о проведении 10 января 2024 года в 11.00 аукционных торгов по продаже изолированного помещения, принадлежащего УП «Минское отделение Белорусской железной дороги»

Сведения о предмете торгов (наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества):

ИЗОЛИРОВАННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ по адресу: г. Минск, ул. Бобруйская, 23-30
с инв. номером 500/D-708029178,
общей площадью 101,6 кв. м,
наименование – бар,
назначение – помещение общественного питания

Начальная цена – 193 006,17 бел. руб.	**Размер задатка** – 19 300,0 бел. руб.

Продавец имущества – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги», 220030, г. Минск, ул. Свердлова, 28; Минская дистанция гражданских сооружений УП «Минское отделение Белорусской железной дороги», 220014, г. Минск, пер. Автодоровский, 11, тел.: (017) 225 22 25, (017) 225 57 89, (017) 225 38 12.
Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 365 48 36

Срок и место приема заявлений: по 08.01.2024 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.
Порядок оформления участия в торгах и проведения аукциона изложен в извещении о проведении торгов, размещенном на интернет-сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы/Недвижимость в собственность»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»)

Телефон для справок: +375 (17) 365 48 36.

ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7»

извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 18 декабря 2023 г. внеочередного общего собрания по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, каб. 316.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ
1. Распределение чистой прибыли Общества за 2022 год.
2. Об утверждении дивидендов за 2022 год.

Место проведения собрания:
г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, каб. 316.
Начало работы собрания в 11.00.

Регистрация участников собрания с 10.00 до 10.50 в день проведения собрания по месту его проведения. Акционеру при себе иметь документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – документ, удостоверяющий личность, доверенность или договор.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра акционеров на 10 декабря 2023 г.

Орган, созывающий собрание: совет директоров Общества, основание созыва: протокол от 04.12.2023 № 04-12/2023.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 17.00, начиная с 06.12.2023, по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, каб. 316.

Совет директоров ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7».

УНП 100088916

Открытое акционерное общество «Стройдетали»

Месторасположение: Минская обл., г. Вилейка, ул. Стахановская, д. 134.

Общим собранием акционеров общества от 05.12.2023 г. (протокол № 45) **принято решение о переносе сроков выплаты дивидендов акционерам за 2022 год.**
Выплату дивидендов продлить с 23.12.2023 по 30.06.2024 года.

Справки по тел.: **(8-01771) 2-25-01, 2-25-10.**

УНП 600246748

Ликвидатор ОАО «Автометрия» Фотя Д.С. организует аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ

с инвентарным номером 100/D-70910, расположенного по адресу: г. Брест, ул. Брестских дивизий, 3/13, площадью 778,0 кв. м,
наименование – **нежилое помещение в строении № 13**
(в здании, являющемся недвижимой историко-культурной ценностью, год постройки: конец XIX века),
распложенного на земельном участке с кадастровым номером 140100000001007193 площадью 0,1738 га
и находящемся в собственности ОАО «Автометрия».

Торги состоятся 18.12.2023 в 15.00 по адресу: г. Брест, ул. Брестских дивизий, 3/13. Начальная цена торгов составляет сумму **396 300,00** белорусских рублей (без учета НДС). Размер задатка (20 000 белорусских рублей) должен быть внесен на следующий расчетный счет продавца: № BY35 PJCB 3012 5039 4910 0000 0933 в ОАО «Приорбанк», г. Брест, BIC: PJCBBY2X не позднее 15.12.2023.

Заявление на участие в торгах и прилагаемые к нему документы принимаются до 17.00 15.12.2023 по адресу: г. Брест, ул. Брестских дивизий, 3/13, предварительно согласовав время подачи по телефону +375 29 7287201. Выигравшим торги признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Величина шага торгов – 5 % (пять) процентов от начальной стоимости лота продаваемого имущества. Победитель аукциона в день его проведения подписывает протокол о результатах аукциона. Договор купли-продажи предметов торгов (лотов) должен быть заключен не позднее 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

УНП 200019653

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

УПЭЎНЕНАСЦЬ У САБЕ І ПАРТНЁРЫ

Ці ўсё вы ведаеце пра ВІЧ

У пачатку снежня ў свеце адзначаецца Сусветны дзень барацьбы са СНІДам. Праблема распаўсюджвання ВІЧ-інфекцыі застаецца актуальнай для ўсіх без выключэння краін. Паводле статыстыкі, тэмпы распаўсюджвання ВІЧ-інфекцыі ў некаторых рэгіёнах захоўваюцца на дастаткова высокім узроўні, і часткова гэтаму садзейнічае недасведчанасць насельніцтва аб спосабах яе перадачы і няправільная ацэнка асабістых рызык. Недахоп інфармацыі аб хваробе і мерах па яе прафілактыцы спараджае велізарную колькасць міфаў, напрыклад, тое, што захворванне перадаецца кантактна-бытавым і паветрана-кропельным шляхамі.
Як праяўляе сябе захворванне і ці можна з ім жыць, не падазраючы пра свой дыягназ? У якой узроставай групе яно найбольш распаўсюджана і які шлях перадачы пераважае? Што прапануе сучасная медыцына, каб падтрымліваць у людзей з ВІЧ нявызначаную вірусную нагрузку і весці звычайны спосаб жыцця, расказала ўрач-эпідэміёлаг аддзела прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі і парэнтэральных вірусных гепатытаў Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ганна РОДЗІЧ.

Каля дзвюх тысяч новых выпадкаў штогод

— Ганна Міхайлаўна, раскажыце, якая сітуацыя з ВІЧ-інфекцыяй у Беларусі. Ці павялічваецца колькасць новых выпадкаў?

— Згодна з глабальнай статыстыкай СААЗ, на планеце жыве больш за 39 мільёнаў чалавек, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту (ВІЧ). За гады эпідэміі ад хвароб, звязаных з ВІЧ-інфекцыяй, памерла больш за 40 мільёнаў чалавек.

У Беларусі з дыягназам «ВІЧ-інфекцыя» жыве больш за 24 тысячы чалавек. За апошнія пяць гадоў штогод у краіне рэгіструецца каля дзвюх тысяч новых выпадкаў ВІЧ-інфекцыі. Што да Мінскай вобласці, то ў рэгіёне жыве 4130 ВІЧ-станоўчых людзей. У апошнія гады штогод выяўляецца каля 300 упершыню зарэгістраваных выпадкаў ВІЧ-інфекцыі.

— Якія першыя сімптомы захворвання? Праз колькі яны праяўляюцца? І ці заўсёды? Ці можна жыць з гэтым захворваннем і не ведаць пра яго?

— Так, чалавек можа быць інфіцыраваны ВІЧ і не ведаць пра гэта. Інфекцыя часцей працягла працякае бессімптомна, і аб сваім захворванні чалавек часам даведаецца ўжо на позніх стадыях. Але прыблізна ў адной трэці людзей інфіцыраванне ВІЧ суправаджаецца клінічнай праявай захворвання на ранніх стадыях.

Першыя сімптомы з'яўляюцца не адразу, у сярэднім ад 1 да 3—6 месяцаў пасля рызыкоўнай сітуацыі. І тут ёсць важны момант: сімптомы неспецыфічныя, гэта значыць, могуць быць характэрны для вялікай колькасці захворванняў ад ангіны да прастуды: падымаецца тэмпература, з'яўляюцца болі ў горле, суставах, павялічваюцца лімфатычныя вузлы, турбуюць скурныя высыпанні — усё гэта называецца медыцынскім тэрмінам «востры рэтравірусны сіндром».

Не маючы вызначанай насцярожанасці ў плане ВІЧ-інфекцыі, можна прыняць гэтыя сімптомы за сезонную прастуду ці грып. А менавіта ў гэты перыяд у крыві чалавека значна павялічваецца колькасць вірусных часціц, таму чалавек найбольш заразны і можа актыўна перадаць вірус. Такім чынам, калі чалавек практыкаваў якія-небудзь рызыкоўныя паводзіны (напрыклад, выпадковы сексуальны кантакт без прэзерватыва) і праз 1—6 месяцаў назіраюцца пералічаныя вышэй сімптомы, трэба абавязкова здаць тэст на ВІЧ.

— Праз які час захворванне сябе праявіць абавязкова?

— Як я ўжо казала, захворванне можа доўга, да 10 гадоў, працякаць

бессімптомна. У далейшым ВІЧ-інфекцыя прыводзіць да паступовага знясілення і аслаблення імуннай сістэмы, надыходзіць апошняя, самая цяжкая, 4-я стадыя захворвання — СНІД (сіндром набытага імунадэфіцыту чалавека). Па меры зніжэння імунітэту далучаюцца наступныя клінічныя сімптомы: страта масы цела, павышэнне тэмпературы, моцнае начное потааддзяленне, хранічная стомленасць, павелічэнне лімфатычных вузлоў, вадкі стул, розныя паўторныя інфекцыі — ангіны, пнеўманіі, скурныя высыпанні, пухліны. Арганізм чалавека ў стадыі СНІД не здольны эфектыўна змагацца з інфекцыйнымі і неінфекцыйнымі захворваннямі.

Распаўсюджаны ў сярэдняй узроставай групе, часцей сярод мужчын

— У якой узроставай групе найбольш распаўсюджана ВІЧ-інфекцыя? І ў якой сацыяльнай групе: нарказалежныя, мужчыны, якія маюць секс з мужчынамі, жанчыны, якія аказваюць секс-паслугі? Які найбольш часты шлях перадачы?

— Найбольшая колькасць новых выпадкаў рэгіструецца сярод мужчын і жанчын ва ўзросце ад 30 да 49 гадоў (маладое і працаздольнае насельніцтва), удзельная вага якіх складае 75,9 працэнта з ліку ўсіх зарэгістраваных выпадкаў. Інфекцыя часцей выяўляецца ў мужчын, іх удзельная вага складае каля 60 працэнтаў.

Пераважае палавы шлях перадачы ВІЧ, ён складае 76 працэнтаў па вобласці і больш як 80 працэнтаў па краіне ад усіх выпадкаў, якія рэгіструюцца. Аднак у Мінскай вобласці застаецца высокай і доля парэнтэральнага шляху інфіцыравання пры ін'екцыйным ужыванні наркатычных рэчываў (20,1 працэнта), гэты паказчык застаецца даволі высокім у параўнанні з іншымі рэгіёнамі краіны.

Сапраўды, ёсць групы людзей, дзе рызыка заражэння вышэйшая, чым сярод астатняга насельніцтва, так званыя ключавыя групы. Гэта, напрыклад, работнікі камерцыйнага сексу, мужчыны, якія маюць сексуальныя кантакты з мужчынамі, або наркаспажыўцы. Гэтым групам удзяляецца значная ўвага спецыялістаў, і на ўзроўні дзяржавы рэалізоўваюцца спецыяльныя прафілактычныя праграмы з даказанай эфектыўнасцю: апіёйдная замяшчальная тэрапія на базе наркалагічных дыспансераў, праграмы абмену іголак і шпрыцаў для нарказалежных людзей, кансультаванне і тэсціраванне на ВІЧ, сацыяльнае суправаджэнне ключавых груп і ВІЧ-станоўчых людзей для ўключэння ў сістэму аказання медыцынскай дапамогі. Прафілактычныя праграмы рэалізоўваюцца на базе дзяржаўных арганізацый аховы здароўя і недзяржаўных некамерцыйных ВІЧ-сэрвісных арганізацый.

Так, у Мінскай вобласці на базе шасці дзяржаўных арганізацый аховы здароўя працуюць кабінеты прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі і парэнтэральных вірусных гепатытаў. Акрамя таго, у рамках выканання дзяржаўнага сацыяльнага заказу на 2022—2023 гады на 5 адміністрацыйных тэрыторыях (у Дзяржынскім, Мінскім, Пухавіцкім, Слуцкім і Смалявіцкім раёнах) беларускае грамадскае аб'яднанне «Пазітыўны рух» рэалізоўвае праект «Мабільны пункт кансультавання і тэсціравання» з прыцягненнем прадстаўнікоў мэтавай групы (наркаспажыўцоў) у прафілактычныя мерапрыемствы па папярэджанні распаўсюджвання ВІЧ, у тым ліку з правядзенне экспрэс-тэсціравання на ВІЧ. За 9 месяцаў 2023 года ВІЧ-прафілактычнымі мерапрыемствамі ахоплена 96,2 працэнта спажыўцоў ін'екцыйных наркотыкаў ад іх ацэначнай колькасці.

— Ці можна заразіцца пры пераліванні крыві і іншых медыцынскіх маніпуляцыях?

— Рызыкі заражэння пры правядзенні медыцынскіх маніпуляцый у медыцынскай установе зведзены практычна да нуля. Ва ўстановах аховы здароўя падтрымліваецца высокі стандарт аказання медыцынскай дапамогі. Маніпуляцыі праводзяцца аднаразовым медыцынскім інструментарыем, а ўся кроў падвяргаецца даследаванню і тэсціраванню, у тым ліку на ВІЧ. А вось калі медыцынскія маніпуляцыі праводзяцца не ў медыцынскіх установах, тады, вядома, рызыка ёсць і гарантый ніхто не дасць.

Бясплатнае лячэнне паказана ўсім

— Вядома, што сёння ВІЧ-інфекцыя — захворванне, якое хоць і не вылечваецца, але кантралюецца. Чым дапамагае прыём прэпаратаў? Ці ўсім інфіцыраваным іх прызначаюць?

— Сапраўды, цалкам вылечыцца ад ВІЧ-інфекцыі ў цяперашні час нельга, аднак існуе эфектыўнае лячэнне, якое, калі пачаць яго адразу, як было дыягнаставана захворванне, і праводзіць рэгулярна, захавае працягласць і якасць жыцця, параўнальную з людзьмі без ВІЧ-інфекцыі. Атрымліваючы лячэнне, чалавек з ВІЧ можа жыць, працаваць, весці звычайны лад жыцця, нарадзіць здаровае дзіця.

Для лячэння ВІЧ-інфекцыі выкарыстоўваюцца антырэтравірусныя прэпараты. Яны змагаюцца з ВІЧ-інфекцыяй, блакіруючы размнажэнне віруса ў арганізме чалавека. Калі чалавек, які жыве з ВІЧ, атрымлівае эфектыўную антырэтравірусную тэрапію, у яго падтрымліваецца нявызначаная вірусная нагрузка, і ён не перадае ВІЧ сваім палавым партнёрам. У нашай краіне такая тэрапія паказана кожнаму чалавеку, які жыве з ВІЧ, і на сёння ў краіне забяспечаны ўніверсальны бясплатны доступ да лячэння ўсім пацыентам з ВІЧ-інфекцыяй. Антырэтравірусную тэрапію ў арганізацыях аховы здароўя Мінскай вобласці на 1 лістапада атрымлівала 96,4 працэнта асоб, якія жывуць з ВІЧ.

— Як даведацца пра свой ВІЧ-статус? Дзе гэта можна зрабіць? Ці ёсць у нас экспрэс-тэсты на вызначэнне ВІЧ-інфекцыі?

— Здаць тэст на ВІЧ можна ў любой установе аховы здароўя, дзе ёсць працэдурны кабінет, — як у дзяржаўных, так і прыватных медыцынскіх цэнтрах, у працэдурным кабінеце аддзела прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі і парэнтэральных вірусных гепатытаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя (г. Мінск, вул. К. Цэткін, 4, працэдурны кабінет 301, тэлефон 8 (017) 258-22-68) або набыць экспрэс-тэст для саматэсціравання на ВІЧ па сліне ў аптэцы, а таксама на базе недзяржаўных некамерцыйных арганізацый. Пасля атрымання станоўчага выніку на ВІЧ з выкарыстаннем экспрэс-тэста па сліне неабходна для ўдакладнення выніку звярнуцца ва ўстанову аховы здароўя і абавязкова прайсці тэсціраванне стандартным лабараторным метадам.Тэст можна здаць ананімна, бясплатна ў дзяржаўнай сістэме аховы здароўя.

— Якая прафілактыка ВІЧ-інфекцыі?

— Прафілактыка ВІЧ-інфекцыі — гэта веданне свайго ВІЧ-статусу, а значыць, перыядычнае тэсціраванне на ВІЧ і іншыя інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам, бяспечныя сексуальныя паводзіны, выкарыстанне прэзерватыва. Прэзерватыў на сённяшні дзень — гэта адзіны даступны прадукт, які абараняе ад заражэння ВІЧ і іншымі ІПШ падчас сексу. Важна ўстрымлівацца ад шматлікіх і выпадковых сексуальных кантактаў, захоўваць вернасць свайму партнёру, адмовіцца ад ужывання наркатычных рэчываў, выкарыстоўваць аднаразовыя шпрыцы і іголкі. Калі мела месца рызыкоўная сітуацыя, напрыклад, кантакт з крывёй ці іншай біялагічнай вадкасцю іншага чалавека, неабходная посткантактная прафілактыка супрацьвірусным прэпаратамі.

Важная і дакантактная прафілактыка — новы кірунак прафілактыкі (напрыклад, пры існуючай пастаяннай высокай рызыцы інфіцыравання ў будучыні). Неабходна і ўстараненне стыгмы і дыскрымінацыі ў дачыненні да людзей, якія жывуць з ВІЧ. Гэта дапаможа разбурыць псіхалагічныя бар'еры, якія перашкаджаюць тэсціраванню на ВІЧ, створыць спрыяльныя ўмовы для змены ладу жыцця і своечасовага звароту па дапамогу і лячэнне, дапаможа зменшыць неабгрунтаваныя страхі і сфарміраваць адэкватнае стаўленне да людзей, якія жывуць з ВІЧ.

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ММЗ имени С.И. Вавилова – управляющая компания холдинга «БелОМО»

Аукцион состоится 28 декабря 2023 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

ЛОТ 1	
Наименование	**Характеристика**
Здание спортивного комплекса с инженерными сетями	1. Здание спортивного комплекса, инв. № 500/С-50239. Назначение: здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения. Общая площадь: 2057,6 кв. м. Год постройки – 1973. Количество надземных этажей, шт. – 3. Количество подземных этажей, шт. – 1. Составные части и принадлежности: А3/к – здание спортивного комплекса, (А3/к) – подвал. 2. Тепловая сеть, инв. № 500/С-1018468. Назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства. Составные части и принадлежности: трубопровод тепловой сети. Протяженность сети – 22,5 м. Год ввода в эксплуатацию – 1973. 3. Хозяйственно-фекальная канализационная сеть, инв. № 500/С-1018467. Назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства. Составные части и принадлежности: трубопроовод хозяйственно-фекальной канализационной сети, колодец хозяйственно-фекальной канализационной сети (6 шт.). Протяженность сети – 136,6 м. Год ввода в эксплуатацию – 1973. 4. Электросеть низковольтная кабельная от ТП-12 до спорткомплекса (инв. № 300106038)
Адрес	г. Минск, ул. Макаёнка, 27
Обременения	Аренда: 1. Договор аренды от 22.01.2021 № 71/38 (площадь – 1 670,5 кв. м, срок действия – 3 года); 2. Договор субаренды нежилых помещений от 01.02.2021 № 0102/2021-3, дополнительное соглашение от 01.02.2021 (площадь – 13 кв. м, срок действия – 31.01.2024); 3. Договор субаренды нежилых помещений от 01.12.2021 № 3011/2021, дополнительное соглашение от 01.12.2022 (площадь – 48,20 кв. м, срок действия – 22.01.2024); 4. Договор субаренды нежилых помещений от 01.11.2022 № 0111/2022-2 (площадь – 10,90 кв. м, срок действия – 31.01.2024); 5. Договор субаренды нежилых помещений от 15.11.2021 № 1511/2021, дополнительное соглашение от 15.11.2022 (площадь – 27,50 кв. м, срок действия – 22.01.2024); 6. Договор субаренды нежилых помещений от 01.02.2023 № 0102/2023 (площадь – 23,60 кв. м, срок действия – 01.02.2025); 7. Договор субаренды нежилых помещений от 01.02.2021 № 0102/2021-4, дополнительное соглашение от 01.02.2022 (площадь – 46,10 кв. м, срок действия – 22.01.2024)
